СЕРАДА 29 ЛІСТАПАДА 1933 г. № 275

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх. ПАДПІСНАЯ ЦЕНА 2 р. у мес. Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-78; кам. рэдактара, партайкома і масавых сектараў 4-76; сектары прамысловы, сельска-гаспадарчы—72; рабоч. спабораніцтва і шаноравацы, сек. будаўніцтва нац. культурнага будаўніцтва 6-15, аддзеў рабочых і калгаснікаў, бюро расследаванняў — 2-00 кантора—55; начная рэдакцыя—4-56.

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Учора адкрыўся раённы з'езд калгаснікаў-ударнікаў.

Пролетарыі Віцебска ўключаюцца ў падрыхтоўку да XVII з'езда УсеКП(б).

Фабрыка „ДЗВІНА" атрымала пераходны сцяг Гаркома КП(б)Б за лепшую пастаноўку партвучобы.

На кожным прадпрыемстве, кожным калгасе прапрацуем перадавы артыкул „Правды" аб XVII з'ездзе УсеКП(б).

НА ЗАВОДАХ І ФАБРЫКАХ МАСКВЫ.

25 лістапада ў Маскве, на заводах і фабрыках з вялікім уздымам прайшлі шматтысячныя рабочыя сходы і мітынгі, прысвечаныя рашэнню пленума ЦК УсеКП(б) аб скліканні XVII з'езда партыі.

Канкрэтныя абавязацельствы аб датэрміновым выкананні гадавога плана, паход імя XVII з'езда партыі па аўладанні тэхнікай, масавай здачы тэхмінімума, ударныя брыгады імя XVII з'езда, новыя вытворчыя падарункі краіны,—такі адказ пролетарыяў Масквы на рашэнне пленума ЦК УсеКП(б) аб скліканні з'езда партыі.

На многіх сходах шырока абгаварваўся перадавы артыкул „Правды", прысвечаны з'езду партыі.

Радам маскоўскіх заводаў і фабрык прынят зварот да ўсіх рабочых аб абвяшчэнні вытворчага пахода імя XVII з'езда. Зварот апублікаван у „Правде" ад 28 лістапада і будзе надрукаван у заўтрашнім нумары „Віцебскага пролетарыя".

Мітынгі ў Віцебскім паравозным дэпо, прысвечаныя падрыхтоўцы да 17-га з'езда УсеКП(б).

Па ўсіх цэхах паравознага дэпо адбыліся мітынгі, прысвечаныя падрыхтоўцы да XVII з'езда УсеКП(б). Прапрацаваны абвестка дня XVII з'езда партыі і перадавы артыкул „Правды" «Семнаццаты». Паміж цэхамі і брыгадамі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку рапарта тав. СТАЛІНУ. Брыгады бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Спараная брыгада паравоза С—56 імя ЦК КП(б)Б машыністы ШПАКОЎСКІ і ПАЛІЦАНАЎ абавязаліся выпусціць з халоднай прамыўкі паравоз сіламі сваёй брыгады і выклікалі на спаборніцтва на лепшае выкананне вытворчых паказальнікаў брыгаду паравоза 19/2 машыністы Сімянаў, Варфаламеяў.

Па ініцыятыве Геруцкага ў дэпо абвешчан масавы ізотаўскі паход па аўладанні тэхнікай за высокія якасныя паказальнікі работы, за моцную працоўную дысцыпліну.

Геруцкі абавязаўся падрыхтаваць свайго качагара ў памочнікі машыніста, а памочніка машыніста—у машыністы. Машыніст тав Дуброўны і інш. паследвалі прыкладу т. Геруцкага.

Схоц абавязаўся павысіць якасць партыйнай вучобы і здаць да 1 студзеня тэхэкзамен на „добра".

Вызная брыгада газеты «Рабочий».

Новая хваля працоўнага энтузіязма.

ХАРКАЎ, 27. Новай хваляй працоўнага энтузіязма, соцспаборніцтва сустракаюць пролетарыі Украіны XVII партз'езд.

На ЭЛЕКТРАМЕХАНІЧНЫМ заводзе ў Харкаве Дзімітруковай аб'явілася да XVII з'езда асвоіць вытворчасць чатырох новых канструкцый Рэле, якія раней ўвазіліся з-за мяжы. Трубапракатны стан «Малы брыдж» Днепрапятроўскага завода імя КАРЛА ЛІБКНЕХТА 25 лістапада скончыў месячную праграму прокаткі труб і перавыканаў заданне на 15,5 проц. На нарадзе лепшых ударнікаў металургічных заводаў, рудніку, новабудоўляў, калгасаў і совгасаў ДНЕПРА ПЯТРОЎСКАЙ вобласці прынята рашэнне арганізаваць усесаюзную эстафету большэвіцкай сустрэчы XVII партз'езда. Лепшы майстра доменнага цэха завода імя ПЯТРОЎСКАГА Высочын, па-большэвіцку арганізаваўшы работу домны № 5 і перавыконваючы вытворчую праграму, паставіў перад сваёй брыгадай задачу даць XVII з'езду 500 тон чыгуна звыш плана.

Неадкладна і поўнасцю выканаць абавязкі перад дзяржавай.

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове аб абавязковай пастаўцы дзяржаве бульбы, апрацоўцы і здачы ільнавалакна дзяржаве па кантрактацыйных дагаворах, абавязаў усе партыйныя, совецкія і загатоўчыя арганізацыі канчаткова скончыць пастаўкі бульбы дзяржаве да 1 лістапада, здачу ільнавалакна на месяц раней устаноўленага тэрміна.

Гэтыя канкрэтныя ўказанні ЦК і ЦКК КП(б)Б мы злачынна парушаем, план паставак бульбы і на сёння па Віцебскаму раёну яшчэ недавыкаран на 20 проц. План здачы ільнавалакна выкананы толькі на 10,2 проц., ільнанасення—89,9 проц.

Злачыннае глыбокае адставанне Віцебшчыны ў выкананні плана паставак бульбы і загатовак ільнапрадукцыі тлумачыцца выключна праяўленнем у радзе сельсоветаў і з боку часткі раённых арганізацый (райзаг) апартуністычнага самацёка, самазаспакоенасці, гніла-ліберальных адносін да кулацкага сабатажа з боку кіраўніцтва некаторых калгасаў і часткі аднаасобнікаў (Рудакоўскі сельсавет—старшыня Гусакоў, калгасы імя Сталіна—старшыня Максімаў, «Прафінтэрн»—старшыня Кузмянкоў, «Шлях да соцыялізма»—старшыня Аверка).

Толькі Нікалаеўскі і Старасельскі сельсоветы на 20 лістапада канчаткова разлічыліся з дзяржавай ПА БУЛЬБЕ, а па астатніх сельсоветах маецца яшчэ запазычанасць ад 165 да 5 тон.

ПА ІЛЬНАВАЛАКНЕ рад сельсоветаў злачынна зрываюць здачу. Так, ВІЦЕБСКІ сельсавет (старшыня т. КРЫЛІЧОНАК) яшчэ зусім не прыступіў да здачы, БАРАЎЛЯНСКІ (старшыня т. КУРАКОЎ) выканаў план толькі на 1,7 проц., РУДНІЦКІ (старшыня т. ІВАНОЎ)—2,1 проц., Даўжанскі (старшыня т. ПІСКУНОЎ)—2,4 проц. і Сялюцкі (старшыня т. ЕРШОЎ)—4,2 проц.

Трэба неадкладна пакончыць з такім адставаннем, зрабіць рашучы пералом у загатоўках. ПЛАН БУЛЬБАПАСТАВАК ПАВІНЕН БЫЦЬ ВА ШТОБЫ НІ СТАЛА СЁННЯ—ЗАЎТРА КАНЧАТКОВА ЗАВЕРШАН КОЖНЫМ КАЛГАСАМ, КАЛГАСНІКАМ І АДНААСОБНІКАМ. Зараз жа таксама правяць як закаваны насенныя фонды бульбы, якасць яе, ці ўцеплены паграбы, ці добра забуртавана бульба.

ПА ІЛЬНАТРАСЦЕ—там, дзе яшчэ не паднят са сцеліча лён (калгас «Колас». Нікалаеўскага сельсовета), трэба неадкладна праверыць і паднясць яго, трэба арганізаваць кругласутачную сушку і апрацоўку, мабілізаваўшы ўсе сілы, скарыстаўшы складаныя і простыя ільнамялкі для апрацоўкі ільнавалакна. Арганізаваць так работу на мяльных пунктах, каб разам з мяцём трасты ішлі трапанне, вязка і адпраўка ільнавалакна на прыёмачныя пункты.

Сельсоветы абавязаны зараз-жа да весці да кожнага калгаса і аднаасобнага пункта аперацыйнае штодзённае заданне па апрацоўцы і здачы ільнавалакна, устанавіць суровы штодзённы кантроль над выкананнем яго.

Максімум увагі—ЯКАСЦІ здаваемага ільнавалакна. На гэту справу павінна быць мабілізавана ўся калгасная грамадскасць. Здаваць ільнавалакно на пункты якасцю не ніжэй 10 нумара—такова задача кожнага калгасніка і аднаасобніка.

Па ільнанасенні план здачы павінен быць выкананы на працягу самае вялікае—двух-трох дзён.

У самы кароткі тэрмін неабходна скончыць пачатую работу па праверцы выканання абавязацельстваў кожным калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам, прымаючы самыя рашучыя меры да тых, хто спрабуе злачынна сарваць выкананне плана паставак бульбы і загатовак ільнапрадукцыі.

Партыйныя, совецкія і загатоўчыя арганізацыі Віцебшчыны павінны ў сваёй рабоце ўлічыць урок загатовак мінулага года, зрабіць урокі з пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб рабоце Віцебскай партыйнай арганізацыі, зрабіць з гэтых урокаў усе практычныя вывады, узяўшы ў аснову сваёй работы пастанову аб'яднанага ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Толькі пры шырокім разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва паміж сельсоветамі, калгасамі, брыгадамі, пунктамі аднаасобнікаў на хутчэйшую здачу бульбы на абавязковых пастаўках і ільнанасення па кантрактацыйных дагаворах, вялучы бязлітасную барацьбу з кулацкім сабатажам і апартуністычнымі элементамі, Віцебшчына можа і абавязана выйсці з таго глыбокага прарыва, у якім яна апынулася па пастаўках бульбы і загатовак ільнапрадукцыі.

Задача сельсоветаў, калгасаў—дні раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў пратвярэзіць у дні неадкладнага і поўнага разліку в дзяржавай па бульбе і ільнанасенні, рашучага пералома ў здачы ільнавалакна, як па колькасці, так і па якасці.

Заўтра—агульнагарадскі сход партактыва.

У чацвер, 30 лістапада, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканні вялікай залі Палаца працы (пакой № 11) склікаецца агульнагарадскі сход актыва віцебскай гарадской арганізацыі КП(б)Б.

НА АБВЕСТЦЫ ДНЯ: ДАКЛАД АБ ВЫНІКАХ ЧЫСТКІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ.

Члены ЦК, ЦКК, ГК і гарКК КП(б)Б праходзяць па сваіх мандатах. Сакратары парткалектываў павінны атрымаць для ячэек білеты штодзённа з 10 гадз. раніцы да 3 гадз. дня ў гаркоме КП(б)Б (пакой № 6) у тав. Вігдэргауз.

Намеснік сакратара гаркома КП(б)Б В. БАШМАЧНІКАЎ.

Урачыстыя провады тав. Літвінава ў Н'ю-Іорку.

НЮ-ІОРК, 26. 25 лістапада провадах Літвінава ў гавані і на барту парахода сабраўся вялікі натоўп, які з выключнай сардэчнасцю вітаў Літвінава.

Пералёт групы амерыканскіх лётнікаў Н'ю Іорк—Масква

У Маскве атрымана паведамленне з Вашынгтона аб прадстаячым пералёце групы амерыканскіх лётнікаў—ПАТРЫДЖА, СОННОРА І ФІНЧА па маршруту Н'ю-Іорк—Бермудскія выспы—Азорскія выспы—Берлін—Масква. Гэты пералёт з'яўляецца сяброўскім гестам у адносінах да СССР у звязку з устанаўленнем нармальных дыпломатычных адносін паміж Совецкім саюзам і Злучанымі Штатамі.

Арганізатары пералёта Н'ю-Іорк—Масква пасылаюць на самалёце выдатныя ўзоры амерыканскіх тавараў для выстаўкі ў Маскве. Пры пералёце назад амерыканскія лётнікі вазьмуць узоры совецкага экспарта для арганізацыі выстаўкі ў Амерыцы.

УЧОРА АДКРЫЎСЯ РАЕННЫ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

Калгаснікі-ударнікі! Усе сілы—на поўнае завяршэнне бульбапаставак і здачы гародніны кожным калгасам, на поўнае завяршэнне здачы лепшай ільнапрадукцыі.

Адкрыццё раённага з'езда калгаснікаў-ударнікаў.

НАРКАМЗЕМ БССР тав. БЭНЕК НА З'ЕЗДЗЕ.

Учора, 28 лістапада, у 7 гадзін 30 мінут вечара ў Белдзяржтэатры адкрыўся ва ўрачыстай абстаноўцы III раённы з'езд калгаснікаў-ударнікаў Віцебшчыны. На з'ездзе прысутнічаюць 264 дэлегата.

З'езд адкрыў нам. сакратара гаркома тав. В. БАШМАЧНІКАЎ.

У работах з'езда прымае ўдзел намеснік старшыні СНК БССР — Наркамзем тав. БЭНЕК.

З дакладам аб гаспадарча-палітычным умацаванні калгасаў і чарговых задачах у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы выступіў начальнік палітаддзела Віцебскай МТС тав. ВОЛКАЎ.

ПРАВА НА ЎДЗЕЛ У З'ЕЗДЗЕ ЗАВАЁВАНА.

Была аднадушная думка калгаснікаў на сходзе у партдзень—заваяваць права на ўдзел ў трэцім раённым з'ездзе калгаснікаў ударнікаў.

Прайшоў тыдзень.

Брыгадзір другой брыгады калгаса „Пяцігодка за чатыры гады", Шумнянскага сельсавета, член партыі Арцёменка разам з групаводам Прохарвым абгаварваюць выкананне прыняга рашэння.

Вынікі па брыгадзе такія: 1 група скончыла абмалот, і калі, усю сілу перакінуць на малацьбу, брыгада змо же за два-тры дні да з'езда скончыць малацьбу, засыпаць насенныя фонды.

Аднак, тут перад кіраўнікамі брыгады паўстае пытанне, а як-жа стане вішча па калгасу? Ці справіцца калгас? Ведае Арцёменка, што першая брыгада адстае і калі не дапамагчы—будзе бяда, не выйдзе да з'езда справа з абмалотам і засыпкай насенных фондаў па калгасу.

* * *

Раніцою, калі кругом яшчэ стаяў змрок, маленькая лятучая нарада брыгады. Слова брыгадзіра—патрэбна дапамога на малацьбе першай брыгадзе. Блізка з'езд. Абмалота па калгасу яшчэ многа. Наша думка, скончыў шаму абмалот звяну перакінуцца ў першую брыгаду, а нам яшчэ больш узняць тэмпы па абмалоту і апрацоўцы ільна.

Так было і зроблена. Звяно ў колькасці 9 чалавек з малатарняй ушло ў першую брыгаду. Застаўшыеся спяшаюцца па сваіх мясцох—на апрацоўку ільна, на малацьбу. Работа ў брыгадзе пачалася.

* * *

У групе па ільну работаюць адказныя па апрацоўцы—Яскін Н. і Сцяпаноўскі С. Пяць жанчын—ЯСКІНА З., ПУГАЧОВА Е., СЕЛІВАНЕНКА М. і ЯСКІНА А. ТРЭПЛЯЦЬ ЛЁН і ЯСКІНА ГАЛЕНА адбірае ад машыны жменю. Работа пастаўлена так, каб не было перабояў, каб апрацоўка шла бесперапынна. Сушка ідзе ў двух бўнях. Пасля апрацоўкі ў адной пераходзяць у другую бўню, а гэту зноў насаджваюць трастой.

Яшчэ з пачатку апрацоўкі ільна валакно было накіравана на пробу. Работа была нездавальняючая—валакно вышла шостым нумарам і таму зараз вельмі туга з выкананнем норм, затое якасць не ніжэй восмага нумара. 500 кг. ільнавалакна павінен здаць калгас—200 кг. апрацавана ўжо брыгадай.

Работае бесперапынна мялка, мерна ўзлятаюць—трапляюць белае валакно трапалкі, як-бы адчаканьваючы сваімі ўзмахамі думку гэтых людзей... «за лепшую якасць», «за тэмпы»... да з'езда.

* * *

Чацверка сытых, ускормленых коняй доўга ходзяць па кругу ля вялікага тока. За першай паркай ідзе Сцефаноўская Харыціна ўжо пажылая калгасніца, за другой паркай—Яскін Міхась. Сцефаноўская руплівa паганяе коняй, бо яна ведае, што ад шпаркага бесперапыннага хода іх залежыць хутчэйшы абмалот, ды і не асабліва давярае яна Яскіну М. што ідзе ззаду яе. Не добра робіць Яскін (да уступлення ў калгас меў цвёрдае заданне), злачынна прамарудзіў ён з наладжаннем ільнамялкі, затрымаў там без падставы работу на два дні, за што быў знят з таго адказнага ўчастка.

На малатарні стаіць брыгадзір Арцёменка, падаюць снапы Пугачова Галена і Яскіна Вольга. Пачырванела Вольга, бо шпарка заграбае снапы малатарка, бесперабойна гадзіну за гадзінай трашчыць яна. Ледзь паспявае адграбаць салому ад малатарні Арцёменка Аўдоцця, бо не чакае Яскіна Проска, Арцёменка і Яскіна М., каб управіцца трасці салому. Салома складаецца тут-жа у таку Яскіным С., Спефаноўскай А. і Арцёменка Ефра сінняй.

Расце паток добраякаснага сухога жыта пад малатарняй. Ад завала да завала ўбіраецца яно для веяння і пасля ўзважвання адвозіцца ў клада вую. Рабочы дзень групы канчаецца толькі ў 10 гадзін вечара. 90 пудоў жыта намалаціла змена.

Напружанай, свядомай работай брыгада адваёўвае права на ўдзел калгаса ў рабоце з'езда.

* * *

Добра ўвесь час працавала другая брыгада. Перадавой у калгасе лічыцца яна. Тут асобныя ўдарніцы Яскіна В. за 10 месяцаў выпрацавала 180 працадзён, Пугачова Галена—185, Арцёменка Ефрасіння—185 і г. д.

Дзякуючы добрай рабоце калгас прыходзіць да з'езда з недрэннымі паказальнікамі—пяць кілограм бульбы, больш двух кілограм збожжа, гародніну атрымліваюць калгаснікі на свой працоўны дзень.

Лепшы ўдарнік брыгады — конюх Арцёменка Ф высунут брыгадай далегатам на трэці злёт калгаснікаў-ударнікаў.

А. СІПКО.

Сваімі ўласнымі сіламі.

У калгасе імя ЛЕНІНА, Нікалаеўскага сельсовета, на 24 лістапада было яшчэ не абмалочана з 30 га збожжа, не засыпана яшчэ 19 цнтн. ячменя і 40 цнтн жыта. Калгасу пагражала паваўўленне правоў на з'езд калгаснікаў-ударнікаў.

24 лістапада быў склікан агульны сход калгаснікаў. Ударнікі калгаса БАГДАНАЎ Александр, ШУЛЬЦ Фёдар і інш. выступілі з абяцаннем, што гэтыя работы будуць скончаны і калгас заваюе сабе ганаровае месца на з'ездзе калгаснікаў ударнікаў. Адагалосна яны адмовіліся ад буксіра з іншых калгасаў, каб сваімі ўласнымі сіламі заваяваць сабе права на з'езд.

У выкананне сваіх абавязкаў у калгасе наладжан кругласутачны абмалот збожжа, разгортваецца засчыка насення.

На з'езд калгаснікаў-ударнікаў вылічан лепшы калгаснік ударнік Шульц Фёдар.

АРЛОЎ, МІНАКОЎ.

Перадавы перадае свой вопыт адстаючаму.

Тры калгаса Віцебскага сельсавета „Большэвік", «1 мая», «Чырвоная армія» да раённага з'езда калгаснікаў-ударнікаў прышлі в выкананнем абавязкаў перад дзяржавай і завяршэннем усіх сельска-гаспадарчых работ.

Калгас «Чырвоная армія» у адзнаку з'езда ўступіў у соцспаборніцтва з адстаючым суседнім калгасам „Іскра" і перадае яму вопыт сваёй работы.

На з'езд ад працоўных аднаасобнікаў ад Віцебскага сельсавета дэлегіраван перадавы аднаасобнік Лебедзеў Савелій з вёскі Белёва, які выканаў усе свае абавязкі перад дзяржавай і ўжо здаў 50 кг мяса ў лік паставак 1934 года.

БУТКЕВІЧ.

ПОЎНАСЦЮ ЗДАЛІ ІЛЬНАВАЛАКНО.

У дні падрыхтоўкі да трэцяга раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў, калгаснікі калгаса імя МОЛАТАВА, Шумнянскага сельсовета арганізавалі ўдарную ільнапрацоўку. Брыгада ў складзе 11 асоб ударна апрацавала лён, 200 кгр. якога (усё наша заданне) здалі дзяржаве 10 нумарам.

Калгаснік КАШЫН.

На з'ездзе—перадавыя аднаасобнікі.

Працоўныя аднаасобнікі вёсак Шчарбакі, Суднікі і Акуленкі, Міхалёўскага сельсовета, у адзнаку з'езда завяршылі ўсе сельска-гаспадарчыя работы, далкам разлічыліся з дзяржавай па ўсіх пастаўках і загатоўках.

На з'езд дэлегіраваны перадавыя аднаасобнікі гэтых вёсак НІКІЦЕНКА ЦІХАН, ТРУСАВА ЕЎДАКІЯ І ПЯТРОЎ ВАСІЛЬ. Алошні, як упрыгожаны дзесяцідворкі паказаў узоры ў барацьбе за поўнае выкананне сваёй дзесяцідворкай абавязкаў перад дзяржавай.

ШАМШУРА.

АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА IV КВАРТАЛА І АБ СТАНОВІШЧЫ МЯСОВАГА БЮДЖЭТА ПА СЕЛЬСОВЕТАХ.

Пастанова прэзідыума Віцебскага гарадскога совета ад 26 лістапада 1933 г.

Заслухаўшы даклад т. АРДЫНЦАВА аб ходзе выканання плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва IV квартала і становішчы мясцовага бюджэта па сельсоветах, прэзідыум гарсовета канстатуе што ВЫКАНАННЕ ПЛАНА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ IV КВАРТАЛА НА 20 ЛІСТАПАДА ТОЛЬКІ НА 50,8 ПРОЦ.—З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ.

АСАБЛІВА ДРЭННА праходзіць выкананне плана па пасенакапленнях СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА—7,7 проц, зварота сельга пазычак—17,2 проц, па ўцягненні ўкладаў у АШЧАДКАСЫ ПА ВЁСЦЫ—2,6 проц, ПАСТУПЛЕННІ ЎЗНОСАЎ ПА ПАДПІСЦЫ НА ПАЗЫКУ СЯРОД КАЛГАСНІКАЎ—23,8 проц, што стварае поўную пагрозу зрыва выканання плана мабілізацыі, сродкаў насельніцтва IV квартала і зрыва выканання плана будаўніцтва прадугледжанага мясцовым бюджэтам.

Гэта тлумачыцца поўнай безадказнасцю, апартуністычным самацёкам у рабоце і бяздзейнасцю з боку праўлення райсаюза, старшынь ССТ (па ШУМНЯНСКАМУ ССТ план выканан на 1,1 проц., па ЗАМАСТОЦКАМУ—19 проц.) і асобных старшынь сельсоветаў (ЗАМАСТОЦКІ, БАРАЎЛЯНСКІ СЕЛЬСОВЕТЫ), а таксама прарывамі ў выкананні дабраахвотных плацяжоў (уклады ў ашчадкасу і збор узносаў па падпісцы на пазыку), што тлумачыцца ў сваю чаргу слабай работай ашчадкас і нізавых камсодаў.

ВЫХОДЗЯЧЫ З ГЭТАГА ПРЭЗІДЫУМ ВІЦЕБСКАГА ГАРСОВЕТА ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За праяўленыя гніла-ліберальныя адносіны да бязлітасных старшынь ССТ АБВЯСЦІЦЬ СУРОВУЮ ВЫМОВУ СТАРШЫНІ РАЙСАЮЗА—т. РАЗУМОЎСКАМУ і абавязаць у дэкадны тэрмін дабіцца пералома і забяспечыць стопроцантае выкананне плана мабілізацыі сродкаў IV квартала не пазней, як да 20 снежня.

За зрыў выканання плана мабілізацыі сродкаў СТАРШЫНЮ РУДНІЦКАГА ССТ т. САКОВІНА АДДАЦЬ ПАД СУД.

2. За ганебныя прарывы ў выкананні плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва IV квартала, што выклікае зрыў выканання мясцовага бюджэта, НАЛАЖЫЦЬ АРЫШТ НА БЯГУЧЫЯ РАХУНКІ ЗАМАСТОЦКАГА І ВЯЛІКА-ЛЁТЧАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТАЎ.

3. Папярэдзіць УСІХ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ, што незабеспячэнне стопроц нтнага спагнання абавязковых плацяжоў (сельска-гаспадарчага падатка, страхоўкі і самаабкладання) і збора ўзносаў па падпісцы на пазыку і пры адсутнасці пералома па ўцягненні ўкладаў у касы ашчадкасы ў дэкадны тэрмін вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасці.

4. Прасіць ГАРПРАФСОВЕТ уключыцца ў выкананне плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва, шляхам уцягнення ў гэтую справу ўсяго прафактыва і дапамогі сельсоветам праз шэфскія арганізацыі.

5. Абавязаць СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ паставіць на належную вышыню работу сельскіх камсодаў, фінансавых секцый і дапытацкіх груп па разгортванні масавай работы па выкананні плана IV квартала і ўзмацніць кіраўніцтва ССТ і сельскімі камісіямі ашчадкасы, заслухоўваючы іх на прэзідыумах сельсоветаў не радзей аднаго раза ў дэкаду.

6. АБАВЯЗАЦЬ СТАРШЫНЮ ГАРКАМСОДА т. ЖУКА і т. АРДЫНЦАВА ўзмацніць кіраўніцтва нізавымі камсодамі фабрык і заводаў для забеспячэння выканання плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва IV-га квартала да 20 снежня, а таксама паставіць на належную вышыню работу існуючых кас ашчадкасы, адначасова арганізоўваючы агенцкія касы ашчадкасы па ўсіх калгасах.

7. Адзначаючы самыя агідныя і злачынныя адносіны рада сельсоветаў да выканання мясцовага бюджэта, вядзення ўчота і справаздачнасці і да захавання бюджэтнай дысцыпліны, якія выражаюцца ў выпадках прыёма плацяжоў без выдачы ўстаноўленых квіткоў і нядбайным хаванні квітанцыйных кніжак (РУДНІЦКІ, ШУМНЯНСКІ СЕЛЬСОВЕТЫ), не вядзенні касавых кніг, а таксама кніг па даходах і выдатках бюджэтных сум (РУДНІЦКІ, ЗАМАСТОЦКІ, ВІЦЕБСКІ СЕЛЬСОВЕТЫ), перавыдатканні сродкаў супроць вызначаных па бюджэту прызначэнняў, а асабліва па адміністрацыйна-гаспадарчых выдатках (ШУМНЯНСКІ, МАШКАНСКІ, РУДНІЦКІ СЕЛЬСОВЕТЫ), бяздзейнасці сельскіх рэвізійных камісій і ўлічваючы, што ўсё гэта спрыяе растратам і самаму грубаму парушэнню бюджэтнай дысцыпліны,—ПРАПАНАВАЦЬ ПАД ПЕРСАНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСОВЕТАЎ У ПЯЦІДЗЁННЫ ТЭРМІН УПАРАДКАВАЦЬ ГРАШОВУЮ ЧАСТКУ СЕЛЬСОВЕТАЎ, не дапускаючы ў далейшым ні на адзін дзень запускаў у вядзенні грашовых кніг, адбіваючых ў іх штодзённа фінансавае станавішча сельсоветаў і забяспечыць стопроцантае паступленне даходаў, прадугледжаных мясцовым бюджэтам.

8. Прыняць да ведама, што за злачынна нядбайныя адносіны і заблытанасць грашовых спраў АДДАН ПАД СУД САКРАТАР РУДНІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА ПАДЗЯВА.

9. За парушэнне бюджэтнай дысцыпліны і ігнараванне вучота і справаздачнасці АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ САКРАТАРУ ВЯЛІКА-ЛЁТЧАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА тав. ЯСІНЕЗУ і МАШКАНСКАГА—тав МАШЭРА.

10. АБАВЯЗАЦЬ СТАРШЫНЬ СЕЛЬСКІХ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ штомесячна вытвараць рэвізіі сельсоветаў, сігналізуючы аб усіх злачынных адносінах работнікаў сельсовета да выканання мясцовага бюджэта, а таксама да справы вядзення ўчота і справаздачнасці па мясцовому бюджэту.

11. АБАВЯЗАЦЬ т. АРДЫНЦАВА і ўвесь апарат гарфа весці самую бязлітасную барацьбу з канкрэтнымі вінаўнікамі ў парушэнні існуючых правілаў вядзення ўчота і справаздачнасці ў сельсоветах і за пушальнікамі бюджэтнай дысцыпліны шляхам сістэматычнага кантроля над сельсоветамі і перадання вінаватых суду.

Старшыня Віцебскага гарадскога совета А. БАСКІН.

„ДЗВІНА“ АТРЫМАЛА ПЕРАХОДНЫ СЦЯГ ГАРКОМА КП(б)Б

Справа гонара кожнага парткалектыва і ячэйкі Віцебшчыны дабіцца заваявання пераходнага сцяга гаркома.

Ганаровы пераходны сцяг імя гаркома КП(б)Б парткалектыву, які дабіўся прыкладнай пастаноўкі справы партыйнай асветы рашэннем бюро гарадскога камітэта партыі ад 24 лістапада г. г. уручаецца партыйнаму калектыву фабрыкі „Дзвіна“.

ДЗЯКУЮЧЫ ЧАМУ ПАРТКАЛЕКТЫЎ „ДЗВІНЫ“ ДАБІЎСЯ ПЕРАМОГІ?

Работа сеткі партыйнай асветы на „Дзвіне“, асабліва за апошні месяц значна палепшылася. Калі ў мінулым годзе партыйную учобу на „Дзвіне“ наведвалі толькі асобныя азіткі, то зараз партыйнымі школамі і палітгурткамі на гэтым прадпрыемстве ахоплены ўсе члены і кандыдаты партыі, спачуваючыя, каля 25 проц. комсамольскай арганізацыі, а таксама беспартыйны актыў.

Ды і не толькі ахоплены, але стала сістэматычна наведваць заняткі. На працягу заняткаў у гэтым навучальным годзе не было віноўнага зрыва заняткаў у сеткі партыйнай асветы.

Партыйны калектыў „Дзвіны“ (сакратар т. ЕВІНТА) надае вялікае значэнне партыйнай вучобе, праводзіць масава выхаваўчую работу, дабіваецца, каб слухачы аккуратна наведвалі заняткі і тому школа і гурткі сеткі партыйнай асветы работаюць бесперабойна, забяспечаны памяшканнем, падручнікамі, прыладамі, добра падрыхтаванымі і вытрыманымі прапагандыстамі. Сапраўдны метады працы пачынаюць шырэй і шырэй распаўсюджвацца паміж школамі, гурткамі, слухачамі, прапагандыстамі на «Дзвіне».

«ДЗВІНА» АТРЫМОЎВАЕ ГАНАРОВЫ СЦЯГ ГАРКОМА КП(б)Б ЯШЧЭ І ТАМУ, ШТО ЎЧОВА Ў ПАРТЫЙНАЙ СЕТЦЫ ЎВЯЗВАЕЦЦА З ПРАКТЫЧНЫМІ ЗАДАЧАМІ ЖЫЦЦЯ ВЫТВОРЧАСЦІ. ТАМУ ШТО СЛУХАЧЫ ПАРТШКОЛЫ І ГУРТКОЎ ЗАЯЎЛЯЮЦЦА ЎДАРНІКАМІ НА ВЫТВОРЧАСЦІ

НЕ ПАДАВАЦЦА „ГАЛАВАКРУЖЭННЮ“ АД ПЕРШЫХ ПОСПЕХАЎ, ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНЕННІ.

Партвучоба на „Дзвіне“ на сёння пастаўлена лепш чым на астатніх прадпрыемствах Віцебска, але з гэтага ні ў якім разе нельга рабіць вываду, што ўсё добра усё ладна і рабіць далей ні чога не застаецца. Рабіць такія выводы, значыць упадаць у памылку. Застаўлівацца на дасягнутым нельга тым больш, што поспехі ў партвучобе на „Дзвіне“ першы незначныя кроўі ў параўнанні з тым, што трэба зрабіць, чаго трэба дасягнуць.

Галоўнае ў рабоце партсеткі — барацьба за стопроцантнае наведванне і лепшую пастаноўку якасці учобы. Гэта баявая задача таксама і парторганізацыі фабрыкі „Дзвіна“, таму што якасць выкладання ў партсетцы „Дзвіны“ вельмі візгае, аб чым гаварылі дамі „Віцебскі пролетарый“ пакінуў канкрэтна, на занятках кандыдацкай школы змены «В», якой кіруе т. Сушкевіч (старшыня фабкома фабрыкі «Дзвіна»).

БАРАЦЬБА ЗА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ ЎЧОБЫ ВА ЎСЁЙ СЕТЦЫ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ, ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ ЗАНЯТКАЎ, ЗА ДАСКАНАЛУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ПРАПАГАНДЫСТАЎ І СЛУХАЧОЎ—ДА КОЖНЫХ ЗАНЯТКАЎ —вось задача кожнага партыйнага калектыва, кожнай партыйнай ячэйкі, школы, гуртка, прапагандыста, слухача.

Не сушыць заняткі квіжнай мовай, доўгімі лекцыямі і інш., а жыва абмеркоўваюць канкрэтнымі прыкладамі з жыцця і работы таго прадпрыемства, дзе работае дадзеная школа, палітгурток, уцягваючы гэтым самым кожнага пасобку слухача да актыўнага ўдзелу ў працоўваным матэрыяле—асноўнае патрабаванне, якому павінен адказваць прапагандыст.

Акуратна наведваць заняткі, не дапускаючы віноўнага прагулу і спазнення, стала рыхтуючыся да заняткаў на аснове социялістычных метадаў працы—спаборніцтва і ўдарніцтва—такая задача кожнага слухача.

ПАМЯТАЦЬ, ШТО СЦЯГ ПЕРАХОДНЫ.

Пераходны ганаровы сцяг гаркома партыі атрымоўвае фабрыка „Дзвіна“. Але гэты сцяг пераходны. За яго павінна змагацца кожная партыйная ячэйка, кожны партыйны калектыў школа, палітгурток, «прапагандыст і слухач. Змагацца не разавымі, агульнымі размовамі і разважаннямі, а канкрэтнай баявой больш эвіпкай работай на лепшай пастаноўцы партыйнай вучобы ў партшколе, кожным палітгуртку.

Шырокі разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва паміж школамі і гурткамі, прапагандыстамі і слухачамі, парткалектывы і ячэйкі павінны неадкладна разгарнуць барацьбу за пераходны сцяг гаркома, дабіваючыся таго, каб сетка партыйнай асветы работала сёння лепш чым учора, заўтра значна лепш чым сёння.

Лепшыя ўзоры работы школ і палітгурткоў не захоўваць, а шырока перадаваць, рабіць іх набыткам усёй нашай сеткі партыйнай асветы—такая задача. Гэта наклодвае вялікую адказнасць на наш друк. КОЖНАЯ ШМАТТЫРАЖКА, НАСЦЕННАЯ ГАЗЕТА, ШТОДЗЁНКА ПАВІННЫ ўключыцца ў барацьбу за пераходны сцяг гаркома партыі і сваім актыўным удзелам забяспечыць стопроцантны ўдзел слухачоў у заняткох, на лепшую іх падрыхтоўку, стадую бесперабойную работу школ і гурткоў, паказваючы ўзоры лепшых, падпяваючы на іх —гэтых перадавікох—астатніх.

П. РУБІНЧЫК, М. КАГАН.

ВОСЬ ЯНЫ—канкрэтныя посбіты—САНОЎНА-БАРСКІХ АДНОСІН да барацьбы ЗА АХОВУ ПРАЦЫ рабочых.

Яшчэ і да гэтага часу на многіх Віцебскіх прадпрыемствах з боку некаторых гаспадарчых і асабліва прафесіянальных арганізацый праяўляюцца савоўна-барскія адносіны да пытання аховы працы, вытворчай санітарыі і тэхнікі бяспекі. Амаль ні на адным прадпрыемстве, абслугоўваемым саюзам, шоўк, шэрсць і трыкатаж, няма грамадскіх інспектараў па ахове працы. Кір ўніцтва ЦП гэтага прафсаюза якое знаходзіцца ў Віцебску, не патурбавалася праверыць выкананне сваіх дырэктыў адносна гэтага. Тому стар шыні фабкомаў «КІМ» (Вайнштэйн), імя Клары Цэткін (Шульман) і інш. з дня на дзень адкладваюць выбары гэтых інспектараў не гледзячы на тое, што на старонках друка аб гэтым пытанні ўжо сігналізавалі неаднакроць.

Фабком фабрыкі «Шэрсць і вата» дапускае агіднае абслугоўванне рабочых начных змен. Абед прывозіцца на фабрыку ў 8 гадзін вечара, а раздаецца рабочым трэцяй змены ў 2 гадзіны ночы зусім халодны.

Да гэтага часу рабочым не раздан калдагавор, які знайсці на фабрыцы вельмі цяжка. Калі рабочы т. Сухаруц кі звярнуўся да старшыні фабкома с. Пінківа з просьбай даць яму калдагавор, яна паслала яго да старшыні РСК, апошні паслаў яго да дырэктара, а дырэктар зноў да старшыні... і так Сухаруцкі дагавора не атрымаў. Гэта кажа аб бюракратызме, які звіў сабе моцнае гняздо на фабрыцы «Шэрсць і вата».

На лесазводзе № 13 прафарганізатар Цэйтлін замест рашучай барацьбы за прывядзенне цэхаў у належнае санітарнае становішча, ацяпленне іх і за бесперабойнае гатаванай вадой, выступае на абарону загадчыка цэха: „У нас усё добра, а што вокны брудныя, вісіць павуцінне і пыл—дык на тое-ж гэта цэх“!

Нібы ў цэху заўсёды павінна быць брудна.

Арганізацыі фабрык «КІМ» і „Сцяг індустрыялізацыі“ і базы Белуціля ўсё яшчэ раскачваюцца ў справе выканання постановы гарпрафсовета і гарКК РСІ аб пабудове дэзінфекцыйнай камеры. Тэрміны праходзяць, а справа не рушыцца з месца.

НА ФАБРЫЦЫ ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН старшыня фабкома т. Шульман замест прыняцця рашучых мер да хутчэйшай пабудовы дэзінфекцыйнай камеры, дзе лараційна заяўляе: «Праз мой труп можаце толькі пабудаваць душы і дзе камеру ў пакоі, вызначаным для душа фізкультурнікаў пры клубе. Я не дам волю, каб пры клубе была лазня. Я буду скардзіцца аж да цэнтра» і акрамя гэтай дэкларацыі яна нічога не зрабіла, каб дзекамеру ўсё-ж пабудаваць. Пастановы гарКК-РСІ і гарпрафсовета такім чынам не выконваюцца.

НА ФАБРЫЦЫ «ДЗВІНА» на цэх прыбіраецца недастаткова, с і ў прыбіральнях, за гатаў пай рабочыя прымушаны бегаць увесь цэх, ад ...ываючыся ад работы 5—10 мінут.

Не лепшае становішча і на ін... МЕНТАЛЬНА-МЕБЛЁВАЙ ФАБР...

Усё гэта сведчыць аб тым, ... барацьба за ахову працы, за сан... у цэхах не стала яшчэ адной з ... ных работ прафарганізацый Віцебск... ны. Да гэтай работы не прыц... рабочы актыў. Толькі за апошні... праўда, мы маем некаторы зрух ... нітарным становішчы. Але-ж зрух больш знадворнага парадк... та ў праходах, але брудна яшчэ ... варштатамі, у кутках. Не пра... вентыляцыйныя ўстаноўкі на «Д... каля кардных машын і гэта ... нармальным, бо кажуць, нама ...

Такія з'явішчы асабліва ... шчальны. Фабкомы павінны пах... аб тым, што справа аховы пра... бочых—іх кроўная справа. Хто ... не разумее—той грае на руку ... ваму ворагу, таму не месца ў ... шэрагах.

Наш совецкі рабочы хоча і ... жыць культурна і культурна пр...

Старшы санітарны інс... ЦСПСБ Б. СНЯЖКО.

АБ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНЦЫ ПАРТВУЧОБЫ З БОКУ ПАРТКАЛЕКТЫВА ФАБРЫКІ „КІМ“ І БЮРО ЯЧЭЙКІ ЗАВОДА „КОМІНТЭРН“.

Пастанова бюро гаркома КП(б)Б ад 24 лістапада 1933 г.

Заслухаўшы даклад аб становішчы партвучобы на фабрыцы «КІМ» і заводзе „Комінтэрн“, бюро гаркома канстатуе, што партыйная асвета на гэтых прадпрыемствах знаходзіцца ў зусім нездавальняючым становішчы. Сетка партыйнай вучобы да гэтага часу знаходзіцца на гэтых прадпрыемствах у стадыі арганізацыі і рэарганізацыі. Не ўсе школы да гэтага часу ўкамплектаваны кіраўнікамі, зусім слаба наведваюцца школы слухачамі. Вельмі часта зрываюцца заняткі і зрыўшчыкі партыйнай асветы не прыцягваюцца да партыйнай адказнасці.

Бюро парткалектыва фабрыкі «КІМ» і бюро ячэйкі завода „Комінтэрн“ не займаюцца штодзённым кіраўніцтвам і кантролем за работай сеткі партыйнай асветы, у выніку чаго наведванне заняткаў партшкол па заводу „Комінтэрн“ не перавышае 50 проц. да агульнага складу партарганізацыі.

Бюро гаркома лічыць гэткія адносіны да справы партыйнай асветы з боку парткалектыва фабрыкі «КІМ» і партячэйкі завода «Комінтэрн» апартуністычнай недаацэнкай выхавання партыйцаў у духу марксіцка-ленінскай тэорыі.

Бюро гаркома ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За недаацэнку і зрыў партвучобы бюро ячэйкі завода „Комінтэрн“ —тт. ЭЛЬТЭРМАНУ, ЯТКАНУ, ІСАКАВУ, ШАЎЛЮКЕВІЧУ—АБВЯСЦІЦЬ ВЫМОВУ і папярэдзіць, што, калі яны ў бліжэйшы час не дабіўцца пералома ў справе паляпшэння работы сеткі партыйнай асветы, бюро гаркома вымушана будзе прыняць больш жорсткія меры партыйнага спагнання.

2. Бюро парткалектыва фабрыкі «КІМ» —тт. ЛЕЎТАВУ, ЛЕВІНСОНУ, КОФМАНУ, БАКХАНУ, ВАЙНШТЭЙНУ, КАГАНУ, ШЫФУ КОБРЫНУ, МАРУШКІНУ—за зрыў партыйнай асветы ПАСТАВІЦЬ НА ВІД, папярэдзіўшы аб неабходнасці ў самы кароткі час скончыць арганізацыю і рэарганізацыю сеткі партыйнай асветы, забяспечыць усе гурткі і школы добра падрыхтаванымі прапагандыстамі і не дапускаць віноўнага зрыва заняткаў.

3. Прыняць да ведама заяву намесніка загадчыка культпропа гК т. РУБІНЧЫКА аб тым, што на фабрыцы «КІМ» у якасці культпропа парткалектыва кіраваў тав. САРАВАЙСКІ і пасланы з кіраўніка кандыдацкіх школ.

4. УСІМ ПАРТКАЛЕКТЫВАМ І ЯЧЭЙКАМ УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ФАБРЫКІ «КІМ» І ЗАВОДА «КОМІНТЭРН» І НА ПАСЯДЖЭННЯХ БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК АБМЕРКАВАЦЬ ПЫТАННЕ АБ ЗАБЕСПЯЧЭННІ БЕСПЕРАБОЙНАЙ РАБОТЫ СЕТКІ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ І АБ ПРЫЦЯГНЕННІ ДА ПАРТЫЙНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЎСІХ ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПАРТВУЧОБЫ, ЗАБЯСПЕЧЫЎШЫ СТОПРОЦАНТНЫ АХОП СЕТКАЙ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ ЧЛЕНАЎ КП(б)Б, КАНДЫДАТАЎ І СПАЧУВАЮЧЫХ І ЛЕПШУЮ ЧАСТКУ БЕСПАРТЫЙНАГА РАБОЧАГА АКТЫВА.

Нам. сакратара ГК КП(б)Б БАШМАЧНІКАЎ.

ЗАЎТРА—АГУЛЬНАГАРАДСКІ СХОД ПАРТАКТЫВА ПА ВЫНІКАХ ЧЫСТКІ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.

ДЗЕ-Ж РАБОТА ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ЦЭХА ЗМАЗЧЫКАЎ?

Пратаколы партыйнай ячэйкі цэха змазчыкаў станцыі Віцебск бераржа хаваюцца ў стале начальніка цэха. Апошні з'яўляецца членам бюро партячэйкі. Прозвішча яго ПРАКОФ'ЕЎ.

Ён нам паказаў папку з пратаколамі пасяджэнняў бюро і агульных сходаў ячэйкі.

Апошнім падшыт да справы пратакол пасяджэння бюро ад 28 кастрычніка. У ім запісана:

СЛУХАЛІ: 1-фармацыю сакратара парткалектыва тав. БОНДАРАВА аб ... выключэнні ПАНЦЕЛЕЕВА з партыі.

ПАСТАНАВІЛІ: Абрать сакратаром ячэйкі змазчыкаў тав. ШЫКІТАВА і ўвесці яго ў склад бюро.

Супярэчнасцей не было. «Былы» сакратар парт'ячэйкі Панцелееў пра вінуўся, ён мае судовую справу за растрату дзяржаўных грошай і бязумоўна быць у партыі, ды яшчэ кіраваць большэвіцкай арганізацыяй такі чалавек не можа.

Аднак і сёння Панцелееў.. сакратар партячэйкі цэха змазчыкаў. Вярней яго і ў парт'ячэйцы змазчыкаў і ў бюро парткалектыва вагонніцаў лічаць сакратаром.

Пратаколы «гавораць», што пасля гэтага пасяджэння бюро, работа ячэйкі спынілася.

Так яно і ёсць на самай справе.

Сакратар партыйнага калектыва Бондараў пасля пасяджэння бюро ячэйкі змазчыкаў абмазгаваў, што рэкамендуемая ім у сакратары кандыдатура Шыкітава не вельмі ўдалая і мала аўтарытэтная. Шыкітаў адчайны з'явіўся праводзіць палітмасавую работу ў цэх... у п'яным выглядзе. Бондараў рашыў лепш выхай сакратарствуе тымчасам Панцелееў.

У ячэйцы змазчыкаў пасля чысткі партарганізацыі засталося 10 комуністаў. Кожны з іх мае згодна пастановы бюро пэўную партыйную нагрузку.

Член бюро і начальнік цэха т. ПРАКОФ'ЕЎ, які паказаў нам папку са справамі ячэйкі запэўніў: «УСЕ ДОБРА ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЕ ПАРТЫЙНЫЯ НАГРУЗКІ». Але яго заяўленні аказаліся... ні больш, ні менш як «очковтирательство». У Пракоф'ева «очковтирательство» увайшло ў звычку. Ён і камісіі на чысткі партячэйкі склаў так зводку, што адцэпак вагонаў па віне змазчыкаў за 10 дзён верасня было 4, калі ў сапраўднасці было—22.

Правярком у сваіх выводах запісаў, што

«ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НА ЧАЛЕ З САКРАТАРОМ ЯЧЭЙКІ ПАНЦЕЛЕЕВЫМ НЕ ЎЗНАЧАЛІЛА БАРАЦЬБЫ ЗА ЗДАРОВЫ ВАГОН, ПАПЛЯЛАСЯ Ў ХВАСЦЕ МАС, СТАЎШЫ НА ШЛЯХ «ОЧКОВТИРАТЕЛЬСТВА» І САБАТАЖА».

Правярком вельмі канкрэтна і чотка намеціў баявую праграму работы партарганізацыі цэха змазчыкаў. Больш таго правярком кожнаму з комуністаў запі аў канкрэтны план работы. Вось адзін з такіх пунктаў.

«ПАД АДКАЗНАСЦЬ ЛЕОНАВА Ў ПЯЦІДЗЁННЫ ТЭРМІН ВЫЛУЧЫЦЬ АСОБНУЮ БРЫГАДУ З СТАРЫХ ВОПЫТНЫХ ЗМАЗЧЫКАЎ, ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ДЛЯ СІСТЭМАТЫЧНАГА КАНТРОЛЯ ЗА ЯКАСЦЮ ЗМАЗЧЫНАГА І ПАДЛІВАЧНАГА МАТЭРЫЯЛАЎ, ЧЫСТАТЫ МАСЛЁНАК І СПРАЎНАСЦІ ІНСТРУМАНТАЎ, СТАВЯЧЫ ПЕРЫОДЫЧНА ІХ ДАКЛАДЫ НА АГУЛЬНЫХ СХОДАХ ЗМАЗЧЫКАЎ».

Пояснем: ЛЕОНАЎ — старшыня цэхкома змазчыкаў.

Ён і ёсць на чыстцы

Забяспечыць бесперабойную і высокаякасную работу чыгуначнага узла—справа гонара усіх рабочых Віцебска.

Павысім рэволюцыйную пільнасць, даб'емся сапраўды жалезнай дысцыпліны на чыгуначным транспарце.

З выступлення начальніка палітаддзела МБВ чыгункі тав. ДАНЕНКА на сходзе паравознікаў дэпо ст. Віцебск 22 лістапада.

Тое, што мае месца ў вас*)—гэта не проста здарэнні, дезарганізуючыя работу транспарта. ГЭТЫЯ ФАКТЫ ПАКАЗВАЮЦЬ АБ НАЯЎНАСЦІ ГНАЙНІКА НА ВАШЫМ УЗЛЕ.

З чагоён складаецца? Многія віруючыя работнікі, асобныя адсталыя рабочыя, адсталыя служачыя не разумеюць, што няма зараз больш рашаючага, важнейшага ўчастка у нашай краіне, чым чыгуначны транспарт. Калі партыя, ЦК, Совнарком заварнулі сур'ёзную ўвагу на гэты рашаючы ўчастак, то зварнуў на яго сваю ўвагу і класавы вораг. Ён (класавы вораг) разумее, што калі партыя і краіна, улічваючы велізарнае значэнне транспарта, узялися за яго по большэвіцку, то вывезуць яго і гэтатаму.

КЛАСАВЫ ВОРАГ ВЫШУКВАЕ КОЖНАЕ ВУЗКАЕ МЕСЦА.

І ім нча туды на кожнае вузкае месца, класавы вораг накіроўвае ўсю сваю ўвагу. Іменна гэтатаму класавы вораг атакаваў транспарт з ўсёй сілай. Вы можаце запытаць:

— А хіба раней яго не было?

КЛАСАВЫ ВОРАГ БЫЎ І РАНЕЙ, АЛЕ ЗА АПОШНІ ЧАС ЁН АСАБЛІВА АКТЫВІЗАВАЎСЯ.

Некаторыя думаюць так: калі-б мне плюнуў у твар кулак, афіцэр, то гэ тым патрэбна абурацца. А калі гэта зробіў п'яніца, прагульшчык, то гэта нічога, гэта ў парадку рэчаў.

Якая-ж розніца паміж тым і другім? Якая розніца паміж чалавекам, які свядома гадзіць і тым, які, прыкрываючыся часам нават партыйным білетам ці рэбочым званнем, па сутнасці гадзіць яшчэ больш? Сутнасць у тым, што ў вас на ўзле не навучыліся яшчэ з сапраўдай большэвіцкай прыматой глядзець на рэчы.

Я хачу прывесці некалькі фактаў.

ПЕРШЫ факт.

Манеўровы машыніст днём (гэта было ў 8 гадзін раніцы) наяжджае на работаючую брыгаду.

Чаму гэта магло здарыцца? Таму, што, па-першае, машыніст, ведаючы што ў яго на пуці працуюць, следуў без свістка, не спыніў паравоз, разгульваў з машынай як п'яны па вуліцы. Таму, што, па-другое: 15 гадавому хлапцу, які рэйкі нідзе не работаў, даверылі віраўніцтва цэлай брыгадай рамонтных рабочых.

Хто вінават у гэтым? Дзе было кіраўніцтва дэпо, ячейка. Дзе быў дзяжурны па дэпо, дзе быў дарожны майстар МІХАЙЛАЎ. Ім, відавочна, усё роўна каму даверыць паравоз Ім не дарагі інтарэсы сацыялістычнай краіны. Яны таксама адказны за гэта здарэнне, а не толькі канкрэтныя вінаватыя.

ДРУГІ факт. Начальнік станцыі, сам абавязан кожнаму экспрэсу выхадзіць насустрач. Але ў вас, у раёне не было такога выпадка. Начальнік станцыі, загада ведаючы, што ў напрамку яго станцыі, рухаецца экспрэс не выйшаў яго сустрэць. Дзяжурны па станцыі, таксама ведаючы аб гэтым, робіць у гэты час манеўры. Манеўровы машыніст «разгульвае» па пуцях.

Што ў такіх людзях можа быць совецкага? Чым яны лепш шпіёна ці кулака?

Чым тлумачыць, што машыніст УСЦІНОВІЧ, праехаўшы аднойчы закрыты семафор, не быў убран хаця б за два—тры гады з адказнейшага ўчастка работы на транспарце. Гэтага не зрабілі віраўнікі дэпо, гэта правяз-ці партыйная і прафесіянальная арганізацыі.

І вось дыялектыка—зноў праезд семафора і здарэнне.

Кажуць, што вор не толькі той хто крадзе, а і той хто арганізуе, укрывае і хавае крадзенае Значыцца вінават і Усціновіч і той, хто паслаў яго.

Якая розніца паміж машыністам, які праехаў семафор і вашым начальнікам дыстанцыі сувязі ДРЭЕМ, у якога пры першых-жа марозах не работала пэнтралізацыя, не работалі семафоры?

Якая розніца, калі у вас на станцыі, дзяжурнымі па станцыі прызначаюцца людзі, якія да 1933 года ніякага ўяўлення не мелі і не маюць аб партыі, аб совецкай уладзе і тым, хто іх паслаў, не пагледзеўшы каго пасылае

Што гэта за Іван Іванавіч. Што гэта за Рыгор Пятровіч, якія пасылаюць на адказную работу такіх людзей?

ТОЛЬКІ АДСУТНАСЦЮ КЛАСАВАЙ ПІЛЬНАСЦІ МОЖНА ТЛУМАЧЫЦЬ ГЭТЫЯ ФАКТЫ.

Зараз адбываецца класавая барацьба больш жорсткая чым раней. Зараз класавы вораг у адкрытую не ідзе. Ён цяпер адкрыта не крыкне: «Далоў совецкую ўладу», а апрануўшыся ў лічыну дыспетчара, дзяжурнага па станцыі і інш., атрымае ўдарную картку, атрымае нават спачуванне асобных комуністаў, і пасля гэтага гадзіць, гадзіць дзе толькі можна, але... «ціхай сапай».

Класавы вораг зараз не будзе арганізоўваць здарэнні адкрыта, а ён спазніцца на тры мінуты, перавядзе стрэлку, але зробіць так, каб было здарэнне, запіша рамонт на паравозе, дзе яго не было і зробіць сваю гнусную справу.

Мала таго, таварышы, што вы сумленныя—гэта вельмі добра. Мала таго, што вы адданы совецкай уладзе—гэта таксама вельмі добра. Мала таго, што вы ўдарнікі, што вы ўдзельнічаеце ва ўсіх праваздзімых кампаніях. Важна яшчэ, каб вы не дапусцілі прысутнасці сярод вас людзей іншых чым вы. Важна каб вашы рады былі ачышчаны ад п'яніц, разгільдзяяў, дэзарганізатараў транспарта.

Мне расказалі такі факт. Да дзяжурнага па дэпо ПЯТРЭНКА падышоў машыніст.

— Ефім Ефімавіч, я па гэтым паравозе не паеду.

— Чаму?—запытвае начальнік.

— Паравоз папсаван.

Начальнік робіць заўвагу, што калі паравоз папсаван, то яго нельга пускаць у дарогу.

Пры праверцы-ж аказалася, што машыніст хлусіў: паравоз быў спраўны.

Гэтае ашуканства засталося-б невыяўленым, каб на гэты момант у дэпо не прысутнічаў начальнік цягі дарогі.

Як можна цярпець такое становішча, калі толькі 40 паравозаў у вашым дэпо маюць спаранную язду, калі ў вас на адным паравозе сяжыць па 20 машыністаў у месяц. Гэта адбываецца таму, што ў вас віраўніцтва раёна, пачынаючы ад начальніка Варсільева, не перабудавалася, што часта сярэняга персанала настолькі прасякнуты канцылярышчынай, штампоўкай, бюракратызмам, што за ўсім гэтым не разумеюць і не хочуць зразумець сутнасці справы.

МЫ БУДЗЕМ СУДЗІЦЬ І ВЫГАНЯЦЬ З ТРАНСПАРТА, ЯК КЛАСАВАГА ВОРАГА ЎСЯКАГА, ХТО ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ПАЙСЦІ Ў РАБОЧУЮ КВАТЭРУ, БАРАК, ПЦЯВЮ БУДКУ, НА КУХНЮ, ДРАЦЦА ЗА ПАЛЯПШЭННЕ РАБОЧАГА БЫТА І СНАБЖЭННЯ, ВЫКОНВАЦЬ ВАЖНЕЙШЫЯ ЎКАЗАННІ ПАРТЫІ І ЎРАДА, АДСІДЖВАЕЦЦА Ў ГАБІНЕТАХ, ХТО, СПАСЫЛАЮЧЫСЯ НА АДСУТНАСЦЬ ДРЭЗІНЫ, ПІ ЎЛАСНАГА ВАГОНА, НЕ ХОЧА ПАЙСЦІ ЗА ПЯЦЬ КІЛОМЕТРАЎ, КАБ АГЛЯДЗЕЦЬ ПУЦЬ.

Мы павінны зрынаваць сцяну, якая перашкаджае нам зрабіць транспарт здаровым, якая перашкаджае разграмніць сабатажнікаў, шкоднікаў, п'яніц, парушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

ТРАНСПАРТ ПАВІНЕН БЫЦЬ І БУДЗЕ АЧЫШЧАН АД ВАРОЖЫХ І ЧУЖЫХ ЛЮДЗЕЙ.

Вы павінны зразумець, што час расхлябанасці, распушчанасці мінаваў. Якіх-бы намаганняў гэта не каштавала, але на транспарце будзе дысцыпліна, як і ў нашай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі Гэта зробіць, гэтага дабіцца партыя і рабочы клас

Сіла партыі заключаецца ў тым, што яна ідзе да рабочага, гаворыць з ім, растлумачвае яму і, абапіраючыся на работны клас,—праводзіць сваю палітыку, змагаецца за аздараўленне транспарта.

ВІРАЎНІЦТВУ РАЁНА ТРЭБА МОЦНА ЗАДУМАЦЦА АБ МЕТАДАХ СВАЁЙ РАБОТЫ, БО ДАЛЕЙ ТАК РАБОТАЦЬ НЕЛЬГА.

Віраўніцтва павінна ўсвядоміць, што мала гаварыць аб дысцыпліне другім, трэб самім у першую чаргу перабудавацца і найстражэй выконваць дысцыплінарны статут. Выконваць самім і прымушаць другіх. Трэба караць парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і самаму несці адказнасць за парушэнне статута.

СПЫНІЦЬ ГАСТРАЛЁРСКУЮ РАБОТУ АПАРАТА.

Выяжджаць на лінію трэба не на паўгадзіны, а на працяглы час. Трэба даваць рэальныя і строга прадуманыя загады, аддаўшы іх патрабаваць стопроцантнага выканання.

Прафарганізацыі павінны выйсці з габінета ў цэх, у жыллё рабочага, сталовую, клуб.

НЕ ЎШЫВАЦЦА РЫПЕННЕМ ПЯРА ЧЫНОЎНІКА, ТЭЛЕФОНАМ, ГАБІНЕТАМ, А СТАЦЬ САПРАЎДНЫМІ АРГАНІЗАТАРАМІ МАС.

Неабходна глыбока зразумець, што няма нічога небяспечней таго, калі комуніст паступаецца інтарэсамі свайго класа ў карысць класавага ворага.

Трэба зразумець і яшчэ раз зразумець неабходнасць перабудовы, адкінуць аліўлійскія метады работы, гнаць з транспарта дэзарганізатараў, ліквідарнікаў, разгільдзяяў, лодыраў. Іх кучка, і мы разам з пролетарыятам выганім гэтых ворагаў социялістычнага транспарта.

Я ГЛЫБОКА ЎПЕЎНЕН, ШТО ПРОЛЕТАРЫ ВІЦЕБСКАГА ДЭПО, ЛЕПШЫ ЯГО КАСЦЯК, ДАПАМОГУЦЬ НАМ У БАРАЦЬБЕ ЗА ГЭТУ ПЕРАБУДОВУ.

ДЫК ДАВАЙЦЕ Ж, ТАВАРЫШЫ, ДРАЦЦА САПРАЎДЫ ПА БОЛЬШЭВІЦКУ, ПА ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКУ ЗА САПРАЎДНУЮ І КАРЭННУЮ ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ ТРАНСПАРТА, ЗА ПОЎНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ РАШЭННЯЎ ЦК УСЕКП(б) І СОВНАРКОМА АБ ТРАНСПАРЦЕ.

ДАВАЙЦЕ РУЙНАВАЦЬ ДА КАНЦА СЦЯНУ БЮРАКРАТЫЗМА, БЕЗАДКАЗНАСЦІ І РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВА

(Аплодысменты).

*) Справа ідзе аб некалькіх аварыйных здарэннях, якія за апошні час мелі месца ў рабоце Віцебскага чыгуначнага ўзла (рэд).

Усебеларускі конкурс-спаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліку і справаздачнасці ў калгасах.

Калгасы! Уключайцеся у конкурс, практычнымі справамі дамагайцеся паляпшэння уліка і справаздачнасці.

ШЫРЭЙ УДЗЕЛ У АГЛЯДЗЕ-СПАБОРНІЦТВЕ.

Толькі калгасы-адзінкі, як гэта бачна з друкуемых сёння матэрыялаў, ключыліся ў агляд-спаборніцтва на лепшую пастаноўку ўліка і справаздачнасці ў калгасах БССР

У КОНКУРС СПАБОРНІЦТВА ЎКЛЮЧЫЛІСЯ ПАКУЛЬ ШТО ТОЛЬКІ КАЛГАСЫ «ПРАВДА», ЗАМАСТОЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА, „ПАБЕДА", ВЕЛІКА-ЛЁТЧАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, «НОВЫ СВЕТ», «ШЛЯХ ЛЕНІНА» І «ШЛЯХ ДА СОЦЫЯЛІЗМА», МІХАЛЁЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА.

Абвешчаны конкурс мае вялікае значэнне ў справе ўстанаўлення правільнага ўліку і яснай, простай, зразумелай калгаснікам справаздачнасці, як важнейшага вагара ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў.

Між тым, як гэта бачна з самага пачатку, справа конкурса сельсоветамі, праўленнямі калгасаў недаацэньваецца. НЕДААЦЭНЬВАЕ ГЭТАЙ СПРАВЫ І ГАРЗА

Трэба работу па конкурсу на лепшую пастаноўку ўліка і справаздачнасці ў кожным калгасе паставіць так, каб вакол уліка загаварылі шырокія масы калгаснікаў, каб калгаснікі ўнеслі свае заўвагі, свае прапановы па спрашчэнні, удасканаленні і рашучым палепшанні ўліка і справаздачнасці, як магутнага вагара ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, за большэвізацыю калгасаў, за заможнае жыццё калгаснікаў.

Шырэй удзел у аглядзе-спаборніцтве на лепшую пастаноўку ўліка і справаздачнасці ў калгасе!

Было-б велічэзнай, грубейшай памылкай абмежаваць работу па конкурсу толькі выяўленнем, фатаграфаваннем існуючага становішча з улікам і справаздачнасцю. Бездакладна, на ходу, па апарацыйнаму выпраўляць выяўляемыя хібы і недахопы, забяспечыць на справе сапраўды большэвіцкую пастаноўку справы ўчота і справаздачнасці—такая задача.

Уключыўся ў конкурс.

АБГАВАРЫЎШЫ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б АБ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ ЎЛІКА І СПРАВАЗДАЧНАСЦІ Ў КАЛГАСАХ, КАЛГАС «ПАБЕДА», ВЯЛІКА-ЛЁТЧАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, УКЛЮЧАЕЦЦА Ў КОНКУРС І ВЫКЛІКАЕ НА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА СУСЕДНІ КАЛГАС „КОМУНАР", СТАРАСЕЛЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА.

СЕЛЬКОР ДЗЯНІСАЎ.

Выклікаем калгас імя МОПР.

Праўленне калгаса імя ЧАРВЯКОВА, Рудакоўскага сельсовета, уключаецца ў конкурс спаборніцтва на лепшую пастаноўку калгаснага ўліка і справаздачнасці

На спаборніцтва выклікае праўленне калгаса МОПР, Селюцкага сельсовета.

Старшыня калгаса ВОРАНАЎ.

Спаборнічаюць на лепшы ўдзел у конкурсе.

Калгасы „ШЛЯХ ЛЕНІНА", НОВЫ СВЕТ" і „ШЛЯХ ДА СОЦЫЯЛІЗМА", Міхалеускага сельсовета, уключыўшыся у абвешчаны конкурс—агляд на лепшую пастаноўку справаздачнасці і уліка у калгасах спаборнічаюць паміж сабой на лепшы удзел у конкурсе.

ШАМШУРА.

ПРАВІЛЬНЫ ЎЛІК—НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА АПЕРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА КАЛГАСАМ.

Артыкул рахункавода калгаса імя „Правды" тав. Ляхоускага.

НАШ КАЛГАС „ПРАВДА", Замастоц кага сельсовета, праз газету «Віцебскі пролетарый» даведаўся аб тым, што абвешчан усебеларускі конкурс на лепшую пастаноўку ўліка і справаздачнасці ў калгасах і, абгаварыўшы перадавы артыкул, газеты ўключаецца ў конкурс.

Я рахункавод калгаса лічу сваім абавязкам расказаць тут аб вопыце маёй работы ў калгасе і, наогул, аб тым, як у калгасе пастаўлен улік і справаздачнасць.

Нам рахункавым працаўнікам калгаса добра вядома, што правільная пастаноўка ўліка, з'яўляецца неабходнай умовай аперацыйнага кіраўніцтва калгаснай гаспадаркай, зброяй у барацьбе з класавым ворагам, які імкнецца разбурыць калгас раскраданнем калгаснай маёмасці. Урэшце, правільны ўлік узнімае інтэнсіўнасць у работе калгасніка, садзейнічае паспяховасці сельска-гаспадарчых работ.

У нашым калгасе 68 гаспадарак. Калгас падзяляецца на 4 паляводчых брыгады і адну будаўнічую.

Перш за ўсё наконт уліка працадзён. Да 1 лістапада ўсім калгаснікам нашага калгаса ў працоўныя кніжкі ўнесены выпрацаваныя імі працадні Гэтыя-ж працадні ўнесены і ў кнігу ўліка працадзён, якая мной вядзецца. У гэтай кнізе на кожнага калгасніка адкрыта старонка, на якіх ўлічваюцца працадні па месяцох. Калгаснікі пры такой сістэме ўліка працадзён звераюць запісаныя ім у кніжкі працадні з занесенымі працаднямі ў кнігу ўліка працадзён калгаса. Старонка напісана ясна і калгаснику лёгка разабрацца, якія работы ён выконваў і што яму за іх налічана.

Дзякуючы гэтаму ў калгасе на сёння дзень няма ніякай затрымкі ў правядзенні размеркавання ўраджая.

Далей. Мной вядзецца кніга ўліка прадуктаў і матэрыялаў. У гэту кнігу ўносяцца прадукты, якія калгаснік атрымоўвае з калгаса. На кожную гаспадарку заведзена спецыяльная старонка ў кнізе. Такім чынам кожны калгаснік пры жаданні можа даведацца, якую колькасць той або іншай прадукцыі ён атрымаў.

Таксама я вяду кнігу руху маёмасці, дзе запісана ўся маёмасць калгаса. У дадатак да яе вядзецца кніга вопіса маёмасці, дзе запісана ўся калгасная маёмасць і каштоўнасці.

Вядзецца таксама касавая кніга са штодзённымі прыбыткамі і выдаткамі грошай. Прыбытак і выдатак запісваецца ў той дзень, калі робіцца аперацыя.

Дрэнна тое, што ў касавай кнізе пры ходзіцца весці і будаўніцтва. Я лічу, што для вядзення будаўніцтва патрэбна была-б асобная кніга. Але-ж гарза чамусці дагэтуль не даў нам форму гэтай кнігі, а яна нам надзвычайна патрэбна.

Я таксама лічу неабходным, каб у кожным калгасе была заведзена самастойная кніга ўзаемных разлікаў.

У кнізе ўліка руху прадукцыі, што дзённа запісваецца прыбытак і выдатак. У гэту-жа кнігу занесен валавы ўраджай калгаса і праведзен запіс засыпкі насенных і страхавых фондаў.

Дасканаласць і правільнасць уліка працадзён затрымліваецца тым, што брыгадзіры несваечасова запісваюць працадні ў працоўныя кніжкі калгаснікаў. Устаноўлены ў нас парадак запіса працадзён кожную пяцідзённую брыгадзірам ігнаруецца. Так, за 15 дзён лістапада большасці калгаснікам яшчэ не запісаны працадні ў іх працоўныя кніжкі.

Праўленне калгаса абавязана рашуча патрабаваць ад брыгадзіраў запіса працадзён кожную пяцідзённу.

Зараз у нашым калгасе заканчваецца абмалот. Заканчваем засыпку насенных фондаў. Ячмень засыпан поўнасцю, поўнасцю засыпана віка, пшаніца, бульба, авёс і ільнанасенне. Праз дзень—два ўся засыпка будзе скончана. Тады прыступім да размеркавання ўраджая.

Нашы дэлегаты на злёце калгасні каў-ударнікаў змогуць з гонарам рапартаваць аб завяршэнні ўсіх сельска-гаспадарчых работ.

РАХУНКАВОД КАЛГАСА „ПРАВДА" ЛЯХОЎСКІ.

УВАЗЕ гарКК—РСІ.

Цыганская школа даведзена да развала.

САНОЎНА-ПАНСКІЯ, ГАБІНЕТНЫЯ МЕТАДЫ „КІРАЎНІЦТВА" ПА РАНЕЙШАМУ КВІТНЕЮЦЬ ВА ЎСЁЙ СІСТЭМЕ РАБОТЫ ГАРАНА.

На Суражскай шашы ў двухпавярховым доме № 92 знаходзіцца цыганская школа: на другім паверсе—класныя пакоі, а на першым—агульнае жыллё вае памяшканне для вучняў.

Бруд, антысанітарыя, непарадак панае ў пакоях агульнага памяшкання цыганскай школы.

Па злачынная нядбайнасці кіраўнікоў школы інтэрнат не ацяпляецца. Халодна і вільготна ў памяшканні інтэрната.

ВУЧНІ КАРЫСТАЮЦЦА СЫРОЙ ВАДОЙ.

Аб гатаванай ежадзе ніхто і не марыць, нават бачка для вады няма. Вучні вымушаны карыстацца сырой вадой, якая знаходзіцца ў брудным вядры з агульнай брудной кружкай.

Тыднямі вучні, якія знаходзяцца ў інтэрнаце не ўмываюцца зноў такі з прычыны адсутнасці вады, рукамыйніка і ручніку.

Праўда, загадчык 28 ФЗС т. АВЕРКА, які з'яўляецца загадчыкам таксама і цыганскай школы «залітаваўся», адпусціўшы некалькі ручнікоў для інтэрната, але гэта нават не ручнікі, а кавалкі грубай радніны, якая ідзе на мяшкі і таму карыстацца імі немагчыма. Гэта не ручнікі, а самыя сапраўдныя рагожкі.

У ГАРАНА ЎСЁ СПАКОЙНА.

Тав. ПЯЧАТНІКАЎ (загадчык гарана) і ГІМЕЛЬШЭЙН (старэйшы інспектар) не цікавяцца становішчам цыганскай школы. Пячатнікаў, калі школа перабіралася ў памяшканне па Суражскай шашы—№ 92 наведаў школу, паглядзеў, палюбаваўся, сказаў пару цёплых слоў (на якія ён, дарэчы, не скупіцца) і ўсё. З тых пор ніхто з работнікаў гарана становішчам цыганскай школы не займаўся. Ніхто з іх у гэтай школе не бывае

Кіраўнікі з гарана не ведаюць таго, што ў цыганскай школе ўжо не 65 вучняў (столькі і было ў пачатку навучальнага года), а толькі 28. Кіраўнікі з гарана не ведаюць таксама і таго, што 19, 20 і 21 лістапада заняткаў у цыганскай школе не праводзілася, што загадчык школы тав. Валошан—рэдкі госць у інтэрнаце вучняў цыганскай школы.

Так, так: для кіраўнікоў гарана—Пячатнікава, Гімельшэйна—усё гэта на вінкі.

ДЫ ЯНО І НЕ ДЗІЎНА, БО САНОЎНА-ПАНСКІЯ, ГАБІНЕТНА БЮРАКРАТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ „КІРАЎНІЦТВА", ЯКІЯ РАШУЧА ВЫКРЫТЫ ПАСТАНОВАЙ ЦК КП(б Б АБ СТАНОВІШЧЫ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ ПА РАНЕЙШАМУ КВІТНЕЮЦЬ ВА ЎСЁЙ СІСТЭМЕ РАБОТЫ ГАРАНА.

З ШАСЦІ БУХАНАК ХЛЕБА ДА ВУЧНЯЎ ДАХОДЗІЦЬ ТОЛЬКІ ЧАТЫРЫ.

Заходзім вечарам у агульнае памяшканне цыганскай школы. Ля маленькага століка размяцілася 18 вучняў. На століку маленькая газовачка, якую, як мы далей даведаліся дасталі самі вучні.

— Большасць вучняў па віне школьнай адміністрацыі дагэтуль не атрымала абутка—апавядае нам стараста —і таму хадзіць абедаць у сталоўку нам не прадстаўляецца магчымасць. Абеды нам адпускае сталоўка № 3 таварыства „Прыхільнікі дзяцей" і ў дастатковай колькасці, дрэнна толькі тое, што не ўсе абеды, якія для нас атрымліваюць нам раздаюцца. Вось, напрыклад 21 лістапада атрымалі 45 абедаў, раздалі-ж вучням толькі 28. З шасці буханак хлеба, якія былі адпушчаны нам на гэты дзень, нам да дасталася зноў-такі толькі чатыры. Не ведаем, хто скарыстоўвае астатнія, бачым толькі, што іх адносяць да варатаўніцы нашай школы РАЧКОЎСКАЙ.

Вучні нам скардзяцца, што ім не даюць магчымасці наведваць лазні, што і ў інтэрнаце яны таксама не ўмываюцца, бо няма вады, інтэрнат да зімы не падрыхтаван.

У мінулым годзе за развал цыганскай групы бяздзейнікі з гарана былі прыцягнуты да адказнасці. Але трэба сказаць, што належных урокаў з гэта га работнікі гарана і па сёняшні дзень не ўлічылі. Школа даведзена да развала І вінават у гэтым у першую чаргу гарана. За гэта павінны па несці суровую адказнасць Пячатнікаў і Гімельшэйн.

Вялікую адказнасць за такое становішча цыганскай школы павінна несці таксама і кіраўнік гарбюро ДКА т. Соколава, якая палец аб палец не ўдарылі для таго, каб скласці умовы, дапамагчы наладзіць работу ў цыганскай школе. Гарбюро ДКА нават да гэтага часу не патурбавалася вылучыць піанерработніка для школы.

За развал работы цыганскай школы таксама нясе адказнасць і гарпраўленне саюза працаседы (старшыня т. МЕКЛЕР) і ячэйка прапасеты (сакратар т. ШЧУЦКІ), з пад увагі якіх зусім выпалі тыя злачынныя, буйнейшыя недахопы, якія маюцца ў рабоце школы.

***

БССР пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, мае велізарныя дасягненні ў справе разгортвання работы сярод працоўных нацменшасцяў, у справе ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі. І таму неабходна з усёй сілай і бязлітаснасцю сурова пакараць тых, хто сваёй злачынай бяздзейнасцю, саноўна-барскімі адносінамі да патрэб цыганскай школы імкнецца дыскрэдытаваць тую выключна вялікую работу, якую праводзіць партыя і совецкая ўлада сярод працоўных нацменшасцяў.

Трэба неадкладна стварыць неабходныя ўмовы для бесперабойных заняткаў у Віцебскай цыганскай школе. Школа павінна работаць. Усе дзеці школьнага ўзросту цыганскага насельніцтва нашага раёна павінны быць ахоплены школай і стала займацца. Усе перашкоды, рагаткі у наладжванні належнай работы цыганскай школы павінны быць рашуча знішчаны, прарывы ліквідаваны. А канкрэтных вінаватых у зрыве навучання цыганскай дзетвары трэба безадкладна прыцягнуць да суровай адказнасці.

К.

КОМСАМОЛЬСКІ ПАХОД ПЕРАТВОРЫМ У ПАХОД УСЕЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ.

ЗА КУЛЬТУРНУЮ, АПЕРАЦЫЙНА-ПРАЦУЮЧУЮ АШЧАДНУЮ КАСУ.

БАЯВАЯ ПУЦЁЎКА пахода:—сто процантаў выканання фінплана.

ЗАСТАЛАСЯ ТОЛЬКІ 32 ДНІ

да таго часу, калі партыя і работы клас пераступаць да пакаранняванняў выканання гадавой праграмы па ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва ў тым ліку і выканання фінансавага плана, як неад'емлемай часткі і аднаго з асноўных рычагоў социялістычнага будаўніцтва.

Толькі 32 дні засталося да другога года другой пяцігодкі

Вось чаму так моцна патрэбуе партыя ад работнікаў фінансавых арганізацый, ад усіх партыйна - комсамольскіх ячэек, прафсаюзна-совецкіх арганізацый і ўсёй пролетарскай грамадскасці—скарыстаць гэтыя застаўшыяся лічаныя дні для поўнага і якаснага выканання гадавога фінансавага плана, звярнуўшы асаблівую ўвагу на поўнае выкананне плана па лініі добраахвотных паступленняў — пазыка, уклады, калектыўнае страхаванне, пае накапленне і г. д

РАШАЮЧАЕ МЕСЦА Ў ВЫКАНАННІ ФІНПЛАНА IV КВАРТАЛА ЗАЙМАЮЦЬ ДОБРААХВОТНЫЯ ПАСТУПЛЕННІ.

Адсюль патрабуецца карэнная перабудова работы ўсяго фінансавага апарата і ў першую чаргу работы сістэмы АШЧАДНЫХ КАС.

ЯК-ЖА РАБОТАЕ НАША СЕТКА АШЧАДНЫХ КАС.

Дрэнна і надзвычайна дрэнна. Большасць работнікаў ашчадных кас не навучыліся яшчэ культурна абслугоўваць клієнта, працягваюць работы па старынны, адсіжваюць пэўныя дні ў пасах, не паказваюцца ў масах працоўных, не вядуць работу з масамі па ўсягаенні вольных сродкаў на зберажэнні ў ашчадныя касы.

Запытайце вы любога загадчыка ашчаднай касы Віцебшчыны, акрамя чатырох кас, аб якіх мы будзем ніжэй гаварыць, аб тым, колькі на фабрыцы, або на заводзе (не кажучы ўжо аб калгасе), маецца фінударнікаў, хто яны такія, як яны работаюць?

Пераважная частка загадчыкаў ашчаднымі касамі не ведае ўдарнікаў фінансавай работы, не вядзе з імі ніякай работы і не ведае ў чым крыюцца асноўныя прычыны прарываў на прадпрыемстве. Іншай характарыстыкі ні ў якім разе нельга даць такім загадчыкам ашчадных кас, як напрыклад: касы № 1—СЛАВІН, № 2—БАРАНАЎ (комсамолец), № 5—АНТАНЕНКА, № 135—АРЛОВА.

Вось вынікі іх работы за 50 дзён на ўкладах у ашчадныя касы: каса № 1 (загадчык СЛАВІН) квартальны план выканала на 0 проц., каса № 2 (загадчык БАРАНАЎ) квартальны план выканала на 16,9 проц, каса № 5 (АНТАНЕНКА)—на 15,10 проц, каса № 125 (АРЛОВА)—на 0 проц. У выніку такой „работы", план па раёну на 20 лістапада па ўкладах у ашчадкасы выканан толькі на 45,8 проц.

Разам з тым у нас ёсць рад ашчадных кас, якія па-большэвіцку змагаюцца за выкананне квартальнага і ўсяго гадавога плана.

Да гэтых кас трэба аднесці касу № 32 (Загадчык Багаи), якая квартальны план выканала на 76,9 проц., касу № 3, якая квартальны план выканала на 70,1 проц, касу № 51 (загадчык Гурэвіч)—на 62,9 проц., агенцтва другога разрада на заводзе «Чырвоны металіст» (загадчык Левін), якая квартальны план выканала на 90 проц.

Нельга сказаць, што гэтыя ашчадкасы пастаўлены ў якія небудзь асаблівыя ўмовы. Не, умовы адноўкавыя з усімі іншымі ашчаднымі касамі Справа толькі ва ўменні скарыстаць актыў, уменні скарыстаць вялічэзнейшыя магчымасці, а самае галоўнае—работа не ў габінеце, а ў цэху, брыгадзе, у масах, з масамі, лепшая пастаноўка абслугоўвання клієнта, сістэматычная дапамога з боку партыйна-комсамольскіх, прафсаюзных арганізацый.

РАЎНЯЦЦА ПА ГЭТЫХ КАСАХ!

Возмем прыкладна ашчадкасу № 3. Тут 75 проц. усіх работнікаў знаходзіцца на прадпрыемствах, у рабочым асяроддзі, уважліва, акуратна і хутка абслугоўваюць клієнта, скалачваюць актыў на прадпрыемствах, які пад іх кіраўніцтвам праводзіць мерапрыемствы па мабілізацыі сродкаў на фабрыках і заводах.

Альбо возмем для прыкладу дзве касы і адно агенцтва непасрэдна з прадпрыемстваў (фабрыка «ПРАФІНТЭРН», К ЦЭТКІН, ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ»). Іх узначальваюць вылучэнцы-рабочыя ГУРЭВІЧ, МІХЛІНА і ЛЕВІН. Першая каса квартальны план выканала па 62,1 проц., агенцтва другога разрада — 90 проц., і каса фабрыкі К. Цэткін выканала больш як на палову.

Гэтыя людзі сумелі падыйсці да рабочага, растлумачыць яму значэнне ўкладаў у ашчадную касу для пролетарскай дзяржавы, выгады для ўкладчыка і пазыкатрымальніка. Пэртыйна-прафсаюзныя арганізацыі гэтых фабрык зразумелі важнасць справы фінпляна, яны гэтую работу лічаць неад'емлемай часткай партыйна-прафсаюзнай работы на прадпрыемстве.

Гэтыя касы работаюць добра, але яны маюць усе магчымасці работаць яшчэ лепш. Задачы іх не паслабляць далейшай сваёй работы, не знікаць узятых тэмпаў, а яшчэ больш умацняць, вучыць на вопыце сваёй работы адстаючыя касы па-большэвіцку вырашаць задачы, пастаўленыя перад сістэмай ашчадных кас.

ПРАЦАВАЦЬ НЕ ПА-ЧЫНОЎНІЦКУ, А ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ!

Прыведзеныя прыклады работы чатырох кас гавораць за тое, што ў нас ёсць усе магчымасці не толькі для выканання, але і перавыканання нашых планаў, трэба толькі каб кожная ашчадная каса працавала сапраўды па-большэвіцку, а не па-чыноўніцку. Справа мабілізацыі сродкаў, яшчэ раз паўтараем, павінна стаць неад'емнай часткай партыйна-прафсаюзнай работы кожнай партыйнай, прафсаюзнай арганізацыі ў цэху, брыгадзе.

ІНІЦЫЯТЫВА ГАРАДСКОГА КАМІТЭТА КОМСАМОЛА, АБ АРГАНІЗАЦЫІ КОМСАМОЛЬСКАГА ПАХОДА ПА ФІНПЛАНУ ІМЯ XV ГОДДЗЯ ЛКСМБ ПАВІННА БЫЦЬ ПАДХОПЛЕНА ЎСЁЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДСКАСЦЮ. Гэты паход павінен ператварыцца ў паход не толькі комсамола, але і ўсіх працоўных. Трэба адчыніць шырока дзверы комсамольскай пуцёўцы ва ўсе цэхі, брыгады—прадпрыемстваў, ва ўсе совецкія ўстановы, арганізацыі, калгасы, пункты сельгаскрэдыту. Віраўніцтва гэтым паходам павінны ўзяць на сябе партыйныя ячэйкі. Пусціць усе рычагі масавай работы ў ход (насценгазеты, шматтыражкі, буксіры і г. д.) для таго, каб наша Віцебская комсамольская арганізацыя адзначыла XV год свайго існавання большэвіцкімі перамогамі і на фронце выканання фінансавага плана.

За час паходу мы павінны паставіць работу ашчадных кас на ўзровень сучасных задач. Ператворым кожную ашчадную касу ў культурную совецкую касу, умацуем нашы касы лепшымі комсамольцамі. Вось задача комсамольскага паходу.

ВІЦЕБШЧЫНА МОЖА І ПАВІННА ЗАВАЯВАЦЬ ПЯРШЫНСТВА.

Яшчэ раз паўтараем—у нас ёсць магчымасці для таго, каб Віцебскі раён ста

Сёння чатырнаццаты ДЗЕНЬ УДАРНАГА САНІТАРНАГА ДВУХДЭКАДНІКА.

РАЗВАЖАННЯМІ ЧЫСТАТУ І ПАРАДАК НЕ НАВЯДЗЕШ.

Патрэбна ДЗЕЙСНАЯ штодзённая работа па ўкараненні санітарнага максімума на кожным прадпрыемстве, у сталоўцы, клубе і рабочай кватэры.

ТРОХКУТНІК ФАБРЫКІ „ПРАФІНТЭРН" ПАВІНЕН ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ НА МЕХАНІЧНЫ ЦЭХ.

На фабрыцы «ПРАФІНТЭРН» адміністрацыя зрабіла некаторы пералом у рабоце па ажыццяўленні санітарнага максімума. Цэхі трымаюцца ў добрым выглядзе, праз кожныя 30 мінут падмятаюцца і ўбіраюцца ўсе абрэзкі. У калідоры і цэхах маюцца палаценцы і гатаваная вада, якая астуджваецца праз халадзільнік. Устаноўлены ўмывальнікі, гэта дае магчымасць рабочым памыць рукі перад абедам. Усе прыбіральні пабелены і знаходзяцца ў самым чыстым выглядзе. Намеціўся некаторы пералом і ў сталоўцы. Абслугоўваючы персанал носіць халаты. На кухні маецца ўмывальнік і гатаваная вада.

Але не гледзячы на тое, што трохкутнік фабрыкі дабіўся некаторых дасягненняў, ён не звяртае належнай увагі на механічны цэх. Гэты цэх самы закінуты ўчастак фабрыкі, у ім пануе бруд, шафы для адзення адсутнічаюць і таму пальто кідаецца куды папала. Рабочыя механічнага цэха даўно ўжо не атрымлівалі мыла і таму ім прыходзіцца замасленымі рукамі есці абед. У гэтым цэху таксама вельмі рэдка мяняюцца палаценцы. Трохкутнік фабрыкі павінен больш увагі звярнуць на гэты цэх, каб прывесці яго ў належны выгляд.

М. БЕЙЛИНСОН.

БАБАШЫНСКІ І ЯЖГУР па-ранейшаму не змагаюцца за чыстату.

Пасля матэрыялаў „Віцебскага пролетарыя" за апошні час у інтэрнаце ФЗВ «Сцяг індустрыялізацыі» навідзен некаторы парадак. Падлога чыстая, на сценах і вокнах няма больш пылу. У інтэрнаце маюцца бакі з гатаванай вадой, але не гледзячы на гэта, пасцельныя прылады, асабліва навалачкі і простыні брудныя. На двары, дзе знаходзіцца інтэрнат вельмі многа бруду. Камендант інтэрната Бабашынскі яшчэ не дабіўся поўнай ліквідацыі маючыхся недахопаў у інтэрнаце. Зараз, калі санітарны дэкадник працягнут, задача дырэктара ФЗВ швейнікаў Зільбер і камендант інтэрната Бабашынскі дабіцца поўнага пералома ў ажыццяўленні санітарнага максімума ў інтэрнатах.

Такое-жа становішчаі ў інтэрнаце панчошнай фабрыкі імя К. Цэткін.

Камендант інтэрната пры фабрыцы імя К. Цэткін—Яжгур да сённяшняга дня не зрабіў поўнага пералому ў ажыццяўленні санітарнага максімума. Па-ранейшаму там пануе бруд і смецце. Падлога ў кватэры № 5 брудная, простыні і ўсе пасцельныя прылады брудныя і пыльныя. Антысанітарыяй асабліва выдзяляецца інтэрнацкая кухня ў доме № 9/2 па Ленінскай вуліцы. На кухні маецца бак для гатаванай вады, але ён вельмі забрудзжны, унутраныя сценкі пакрыты тоўстым слоем грязі. Аб гэтым добра ведае камендант інтэрната Яжгур, але не жадае змагацца, каб ліквідаваць гэтыя агіднасці.

За бяздзейнасць камендант інтэрната Яжгур павінен быць пакаран.

ПУЧКОЎ, КУНЦЭВІЧ.

Дошка ганьбы

зрыўшчыкаў, сабатажнікаў ажыццяўлення санітарнага максімума.

31. Васільеў—загадчык ватэрнага цэха фабрыкі «Дзвіна» дапускае антысанітарыю ў цэху, не прымае ніякіх мер, каб заўсёды была гатаваная вада.
32. Мануйко—старшы майстар ватэрнага цэха, бяздзейнічае і парушае санітарны максімум.
33. Левінсон—загадчык сталоўкі Загатзбожжа—дапускае парушэнне санітарнага максімума і антысанітарыю ў сталоўцы

ЗНІМАЮЦЦА З ДОШКІ ГАНЬБЫ.

1. ДАХІН—загадчык крамы ЗВК. Пасля змяшчэння яго на дошку ганьбы, адразу зрабіў пералом у ажыццяўленні санітарнага максімума.
2. ФЕЙГІН—загадчык сталоўкі абутковай фабрыкі імя Лекерта—падцягнуўся, у сталоўцы наведзена чыстата і парадак.

Чакаем ад гэтых таварышоў больш узмоцненай работы па ажыццяўленні санітарнага максімума у крамах і сталоўках.

Чакаем ад занесеных на дошку ганьбы настойлівага змагання за права быць знятымі з гэтай ганебнай дошкі.

Клопаты аб пераварэнні зімы ў цёплую, не датычацца фабкома.

Сталінскі паход па арганізаваны сустрэчы зімы не знайшоў свайго адбітка на люстэркавай фабрыцы. Ніхто з работнікаў фабкома не ведае колькі і каму патрэбен рамонт кватэр. На меснік старшыні фабкома ЭЛКІН не ведае нават хто з членаў фабкома выпучан для выяўлення патрэбы ў рамонце кватэр. Да сённяшняга дня яшчэ каля 40 асоб не атрымалі ордэраў на дровы.

Не лепш абстаіць справа і з правядзеннем у жыццё санітарнага максімума на самой фабрыцы. У кожным цэху маюцца бакі для гатаванай вады, а вады ў іх няма, краны не дзейнічаюць (зборачны, стамярны, шліфавальны цэх). Ва ўсіх цэхах па вуглах ляжаць кучкі смецця, а прыбральшчыца АЛІЦКАЯ не сачыць за тым, каб трымаць цэхі ў чыстаце. У некаторых цэхах няма вешалак (зборачны), кожны з рабочых вешае сваё пальто там дзе працуе. У цэхавых аптэчках акрамя іода і марлі нельга нічога знайсці. Гэтыя медыкаменты ўтрымліваюцца ў пылу, яны ляжаць сумесна з хлебам і розным паперай. Аб усіх гэтых агіднасцях добра ведаюць намеснік старшыні фабкома ЭЛКІН і сакратар партыйнай ячэйкі САЛАМОНІК, але яны не знайшлі патрэбным займацца гэтым пытаннем. Не гледзячы на тое, што санітарны двухдэкадник ідзе ўжо 14 дзён, на люстэркавай фабрыцы дагэтуль не пачалі змагацца за ажыццяўленне санмаксімума.

С.—Е.

Загадчык асенізацыйнага абоза АСТРОЎСКІ дапускае у сябе на двары антысанітарыю і насаджае бруд. (З кораўскага допіса.)

„Змагар" за санітарыю...

...А на скурзаводзе так і зжыліся з брудам.

Не гледзячы на тое, што аб скурзаводзе многа пісалі ў газеце «Віцебскі пролетарый», на заводзе яшчэ і дагэтуль не бачна сапраўднага пералому. У гародня - хавальні вельмі брудна, падлога рэдка мыецца і таму яна заўсёды чорная. У скрыні, дзе стаіць пасуда многа прусакоў, яны пападаюць на пасуду, а потым у гэтай пасудзе выдаецца абед. Не лепшы малюнак у пакоі, дзе знаходзіцца душ. Там падлога вельмі брудная.

Гэтыя агіднасці паказваюць, што сігналы «Віцебскага пролетарыя» яшчэ не дайшлі да трыкутніка скурзавода. Не гледзячы на тое, што загадчык сталоўкі ЛУКІН занесен на чорную дошку, ён яшчэ не зрабіў пералома на кухні і ў сталоўцы.

Трыкутнік скурзавода справу ажыццяўлення санітарнага максімума пусціў на самацёк.

С. ШЫДЛОЎСКІ.

НА ЛЕЙПЦЫГСКАЙ ІНСЦЭНІРОЎЦЫ.

„Палітычны комплекс" правакацыі і хлусні.

ПА ДПАЛЬШЧЫКІ РЭЙХСТАГА ПРАБУЮЦЬ „ДАКАЗАЦЬ" ПАДРЫХТОЎКУ КОМПАРТЫЯЙ УЗБРОЕНАГА ПАЎСТАННЯ І ПАДПАЛАЎ.

ЛЕЙПЦЫГ, 27. Сёння суд прыступіў да разбора „палітычнага комплекса". У залі суда маці Дзімітрава. Калі яна ўваходзіць, Дзімітраў прывітае яе, усміхаецца і маша рукой.

„Палітычная частка" працэса пачынаецца выступленнем чыноўніка крымінальнага дэпартамента пры паліцэй-прэзідыуме ў Берліне ГЕЛЕРА, у ведамі якога знаходзіцца нагляд за комуністычным рухам у Германіі. Гелер выклікан у якасці сведкі. Яго задача намаляваць малюнак, які папярэдзічаў пажару рэйхстага, прадставіць матэрыял аб „падрыхтоўцы компартыі да ўзброенага паўстання" і аб антыдзяржаўнай дзейнасці комуністаў. Гелера не дапытваюць. Гелер робіць даклад, які працягваецца на працягу ўсяго пасяджэння з 10 гадз. раніцы да 4 гадз. вечара. Гэта, па сутнасці, прадраканне прамовы пракурора. У дакладзе Гелер спасылаецца, з аднаго боку, на розныя „дакументы" Выканкома Комінтэрна, ЦК германскай компартыі, акруговых канферэнцый, партыйнага друка і г. д., а з другога бока—на паведамленні правінцыяльнай паліцыі і сакратныя паліцэйскія данясенні. У частцы, якая асноўваецца на парыйных дакументах і выказваннях асобных кіраўнікоў комартыі, ён па сутнасці пад цвярджае раней даданыя некаторымі комуністычнымі актывістамі на судзе паказанні аб палітычнай лініі партыі ў гэты перыод. Гелер не прыводзіць ніводнага дакумента, які паказваў-бы, што компартыя Германіі лічыла абстаноўку рэволюцыйнай і высоўвала лозунг узброенага паўстання. У прыведзеным ім цыркуляры берлінскага акружнога камітэта компартыі ад 9 лютага гаворыцца, што ў Германіі няма рэвалюцыйнай абстаноўкі.

Другая частка даклада Гелера, мета якой „паказаць" падрыхтоўку компартыяй узброенага паўстання, базуецца на паліцэйскіх данясеннях і матэрыялах таемнай паліцыі. Гелер лічыць, што компартыя прытрымлівалася двух бакоў дзейнасці—легальнай і нелегальнай. На яго думцы, цэнтр цяжара ў рабоце компартыі складала нелегальная работа. Гелер прыводзіць выняткі з брашуры Лангера «Шлях да перамогі», якую ён лічыць належачай партыі комуністычнага актывіста Кіпенберга. З гэтай брашуры ён прыводзіць цытаты аб тым, што індывідуальныя акты не змогуць быць аддзелены ад масавай барацьбы ў перыод узброенага паўстання. Гелер сцвярджае, што падобнае меркаванне абвяргае пракламіруемую компартыяй адмову ад індывідуальнага тэрора. Ён сцвярджае, што ў радзе месц былі арганізаваны спецыяльныя нелегальныя курсы, на якіх вывучалася ваенная справа.

Такія курсы, па яго сцвярджэнні, былі праведзены ў Берліне ў снежні 1932 года. Гэта сцвярджэнне Гелер базуе на паведамленні нейкага Добрыка, які адбыгаў турэмнае зняволенне за «палітычнае забойства», потым быў выпушчан паліцыяй і ўстанавіў сувязь з компартыяй. Па давяленні гэтага Добрыка, слухачы курсаў «зразумелі» свайго настаўніка такім чынам, што компартыя прызначыла ўзброенае выступленне на канец лютага 1933 года.

Далей Гелер прыводзіць рад сакрэтных данясенняў таемных паліцэйскіх агентаў аб нелегальных сходах, у прыватнасці аб выступленнях Торглера і г. д.

У звязку з гэтым ТОРГЛЕР двойчы заяўляе, што не прысутнічаў на сходах, аб якіх гаворыцца ў данясеннях паліцэйскіх агентаў, і, значыцца, не гаварыў прыпісваемага яму.

Адвакат ЗАК заяўляе, што Гелер дае паказанні не на аснове сваіх наглядняў, а на аснове матэрыялаў, атрыманых з трэціх рук. Ён выказвае апасенне, што гэта выкліча неабходнасць прыцягнення новых сведак і зацягне працэс. «Я,—гаворыць Зак,—абараняю чалавека, Торглера, і магата му гатоў адмовіцца ад выкліка сведак у супроцьвагу сведкам абвінавачання па гэтым пытанні. Але Торглер можа патрабаваць выкліка такіх сведак, тады можа ўзнікнуць вялікая палітычная дыскусія і працэс зацягнецца».

Пракурор ВЕРНЕР лічыць, што паведамленне Гелера з'яўляецца «чыста сведчымі паказаннямі» і што, у выпадку неабходнасці, можна будзе выклікаць кой-каго з дэвераных асоб, якія далі паведамленні паліцыі. Па яго думцы, зацяжку працэса для высвятлення такога важнага пытання зусім не можа лічыцца залішнім.

Пасля гэтай заявы выступае ДЗІМІТРАЎ. Ён заяўляе, што нічога не мае супроць паліцэйскай дыскусіі, як і супроць таго, каб былі апублікаваны ў друку і паведамлены на працэсе ўсе матэрыялы, прыводзімыя Гелерам, але пры гэтым павінна быць строга разграмкавана, што датычыцца да даку мантаў компартыі і што з'яўляецца паліцэйскімі данясеннямі. Суд тут-жа наладжвае нараду для прыняцця рашэння па гэтаму пытанню і прыходзіць да таго вывада, што Гелер можа даваць паведамленні не толькі на падставе ўласных назіранняў, але і на падставе звестак з трэціх рук. Пытанне аб каштоўнасці гэтых паведамленняў павінна быць вырашана судом. У рашэнні суда ўказваецца, што ў сваіх паведамленнях Гелер павінен абмежавацца такім матэрыялам з іншых крыніц, які базуецца на артыкулах у органах друка, па арыгінальных дакументах, брашурах і г. д. і якія могуць быць праверены, а так тама на паведамленнях чыноўнікаў, бо «разбор дакументаў, якія базуюцца на іншых крыніцах, становіць цяжкасці, і гэтыя крыніцы не могуць разглядацца як выстарчальна пэўныя пры іншых умовах».

Потым Гелер робіць рад паведамленняў на аснове матэрыялаў таемнай паліцыі, прыводзячы ў прыватнасці данясенні ў берлінскі паліцэй-прэзідыум аб тым, што ў розных мясцох нібыта падрыхтаваўся захоп электрычных станцый і іншых жыццёва - важных прадпрыемстваў. Гелер гаворыць, што ў той самы перыод берлінскай паліцыяй быў арыштаван нейкі комуністычны актывіст, у якога нібыта была знойдзена заметка аб тым, як разбурыць жыццёва-важныя вытворчасці і захоплізаць стратэгічна-важныя пункты, накшталт казармы і г. д.

ДЗІМІТРАЎ задае Гелеру пытанне: «Калі гэта было?»

ГЕЛЕР: «Гэта было часткова ў люты, да пажара рэйхстага, а часткова пасля пажара рэйхстага».

Потым Гелер сцвярджае, нібыта ў радзе месц былі арганізаваны тэрарыстычныя групы, а таксама збіраліся выбуховыя матэрыялы, зброя і право дзілася работа сярод паліцыі, рэйхсвера і г. д. Паведамленні Гелера ў многіх выпадках і па вместу і па напрамку супадаюць з тымі публікацыямі, якія да гэтага былі вядомы ўжо па выданай напыянал соцыялістамі кнізе Эрта „Узброенае паўстанне".

ЗБІРАЮЦЦА СЛЕДВАЦЬ ПРЫКЛАДУ ПАЗШ.

Н'Ю ЮРК, 25. Паводле паведамлення «Н Ю ЮРК ТАЙМС», бразільскі міністр фінансаў заявіў прадстаўніку друку, што Бразілія і іншыя паўдзённа амерыканскія крэіны гатовы, следуючы прыкладу ПАЗШ устанавіць вармальныя адносіны з СССР.

НОВЫ ФРАНЦУСКІ УРАД.

ПАРЫЖ, 26. ШОТАН сфармаваў урад з 18 міністраў. У складзе габінета ў большасці радыкал-соцыялісты, у тым ліку прем'ер і міністр унутраных спраў ШОТАН, міністр фінансаў БОННЕ бюджэта МАРШАНДО, ваенны ДАЛАДЭ марскі САРО авіацыі КОТ, міністр замежных спраў БОНКУР не належыць ні да якой групоўкі Міністр асветы де МОНЗІ—член групы распубліканскіх соцыялістаў. Усе міністры габінета Шотана, за выключэннем чатырох, уваходзілі ў склад габінета Саро. Уключэнне ва ўрад у якасці віцепрэм'ера і міністра юстыцыі РЭЙНАЛЬДЗІ—прадстаўніка сенацкай правацэнтрысцкай групы, сведчыць аб узмацненні тэндэнцыі стварыць урад „канцэнтрацыі".

АБВАСТРЭННЕ СУПЯРЭЧНАСЦЯЙ У ЛАГЕРЫ ГАМІНДАНА.

ШАНХАЙ, 26. Па словах амерыканскай „ЮНІНГ ПОСТ" да межаў правінцыі Фудзян перакідваецца з раёнаў Бейпіна і Ханькоу чатыры дывізіі. Фрахтуюцца суды для перавозкі войск. Нанкінскія самалёты працягваюць разведку ў правінцыі Фудзян і скідваюць лістоўкі. Блокада Фудзяна з мора ўжо пачалася. Тым часам кантонскія ўлады працягваюць умацоўваць павіцы на межах правінцый Гуандун і Фудзян. Нанкінскі ўрад загадаў арыштаваць кіраўнікоў фудзянскага ўрада У кітайскай частцы Шанхая абвешчан ваенны стан Па словах японскіх газет, у Шанхаі арыштаваны два гарнізонных генерала, якія абвінавачваюцца ў падтрыманні сувязі з рухам у Фудзяне.

Паводле паведамлення „СІМБУН РЭНГО", у Фучжоу (правінцыя Фудзян) нарада консульскага корпуса пад старшынствам японскага консула рашыла не ўмешвацца ў меры фудзянскага ўрада, накіраваныя да захопу прыбытку мясцовых мытняў і да «іншых ненармальнасцей», пакуль не стаіць пагроза для чужаземных інтарэсаў.

АБ КОНКУРСЕ СЕЛЬСОВЕТАЎ.

Пастанова бюро ГК КП(б)Б і прэзідыума гарсовета ад 24 лістапада 1933 года.

Надаючы выключна важнае палітычнае значэнне апошняму этапу ўсесаюзнага конкурса на лепшы на рабоце сельсовет, выходзячы з пастановы ЦК КП(б)Б, бюро ГК КП(б)Б і прэзідыум Віцебскага гарсовета ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Правесці 30 лістапада 1933 г. адзіны совецкі дзень, прыцягваючы да ўдзела самыя шырокія масы калгаснікаў, рабочых совгасаў, МТС і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, паставіўшы ў парадак дня сходаў падвядзенне вынікаў работы сельсоветаў і яго секцый, дэпутацкіх груп і асобных работнікаў у час правядзення ўсяго комплекса сельска-гаспадарчых работ, увязваючы гэту работу з падрыхтоўкай да 3 раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў.

Абавязаць старшынь сельсоветаў, сакратароў сельпартячэек разгарнуць шырокую масавую работу па падрыхтоўцы да адзінага совецкага дня.

2. Для дапамогі ў правядзенні адзінага совецкага дня накіраваць ў сельсоветы групу кіруючых работнікаў, даручыўшы тт Варшаўчыку і Фаміну намецець кандыдатуры гэтых работнікаў з тым, каб не пазней 24-XI яны былі на мясцох. Вынікі правядзення адзінага совецкага дня абгаварыць на пленумах сельсоветаў з тым, каб матэрыялы аб рабоце сельсоветаў, складзеныя па форме ЦВК Саюза ССР, былі зацверджаны пленумам сельсоветаў.

3. 9 снежня 1933 года склікаць пашыраны прэзідыум гарсовета з удзелам усіх старшынь сельсоветаў, лепшых кіраўнікоў і членаў секцый дэпутацкіх груп сельсоветаў. На прэзідыуме абгаварыць і зацвердзіць кандыдатуры сельсоветаў—старшынь сельсоветаў, старшынь дэпутацкіх груп, падлягаючых прадстаўленню для прэміявання.

4. Абавязаць прысутнасцю на ўсебеларускай радыо-пераклічцы тт. БАСКІНА, БАШМАЧНІКАВА, РАГОЖКІНА, КУРЦІКА. Дакладчыкам зацвердзіць т. БАСКІНА.

5. Абавязаць рэдакцыю „Віцебскі пролетарый" уключыцца ў конкурс, шырока асвятляючы работу советаў, ход соцспаборніцтва, ход вынікаў конкурса ў асобных сельсоветах.

Намеснік сакратара ГК КП(б)Б
В. БАШМАЧНІКАЎ,
Старшыня гарсовета А. БАСКІН.

ЗАБЯСПЕЧЫМ ШЫРОКАЕ РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ГАЗЕТЫ „АКЦЯБР" І ЧАСОПІСА „ШТЭРН"

На выклік рабочага калектыва вагонабудаўнічага завода імя Ланцуцкага за павышэнне тыражу газеты «Акцябр» і часопіса «Штэрн» рад прадпрыемстваў адказвае канкрэтнымі справамі.

Фабрыка „СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" абавязалася распаўсюдзіць 350 экз. газеты „Акцябр" і 50 экз. часопіса „Штэрн". Ужо распаўсюджана 177 экз. газеты „Акцябр" і 8 экз. часопіса «Штэрн». Абутковая фабрыка імя ЛЕКЕРТА распаўсюдзіла 90 экз. „Акцябра" і 30 экз. „Штэрн".

Аднак, рад прадпрыемстваў яшчэ нават не абгаварылі выклік завода імя Ланцуцкага і як вынік, па гэтых прадпрыемствах і арганізацыях мы не маем роста падпіскі на зімняй нацменаўскі друк. Такімі з'яўляюцца фабрыкі „Прафінтэрн", „БІМ", імя Клары Цэтзін, саюз будаўнікоў і г.д.

Неабходна большэвіцкімі метадамі ў бліжэйшыя дні выканаць абавязацельствы, узятыя прадпрыемствамі па распаўсюджанні нацыянальнага друку.

ФАБРЫКАНТ.

Рэдакцыі газет «ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ» і «РАБОЧИЙ» склікаюць сёння у 6 гадзін вечара, у Палацы працы (пакой № 11)

агульнагарадскі сход рабкораў і рэдактараў фабрычна-заводскіх шматтыражак і насценгазет.

Парадак дня: Усебеларускі масава-вытворчы паход імя тав. Гікало і задачы нізавога фабрычна-заводскага друку і рабкораў.

Рэдакцыі газет „ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ" і „РАБОЧИЙ".

1 снежня г. г., у 6 гадзін вечара, у вялікай залі гаркома КП(б)Б адбудзецца

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД ДЭКАДНАГА КОМВУЗА.

На сход павінны з'явіцца сакратары партколектываў і ячэек, цэхячэек, групарторгі, партарганізатары вытворчых участкаў, пад асабістую адказнасць сакратароў партколектываў.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

Сёння 29 лістапада ў 7 гадз. вечара ў Палацы працы, пакой № 14, адбудзецца ПЛЕНУМ СЕКЦЫІ ПРАЦЫ І БЯСПЕКІ.

ГАРТЭАТР (Канатная вул). 29, 30 лістапада Оперэта ў 3-х дзеях **КОЙМЕНКЕРЭР**. Дзярж. Яўр. тэатр НКА УССР. Фэфэр і Фідэль. Білеты ў касе тэатра.

Кіно «1 МАЯ». З 29 лістапада новы гукавы гістарычны фільм (1767-68 г.) **КАЛІЕУШЧЫНА**. Пачатак у 6 гадз.

«ПРАЛЕТКІНО». толькі 29 і 30 лістапада **ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ** (новы экземпляр). Пачатак 1 сеанса ў 6 гадз.

КІНО „СПАРТАК". З 28 лістапада 1-ы раз у Віцебску замежны фільм **БАНДЫТКА**

Завод „Комінтэрн" Белкультпрамтрэста НКЛП БССР (вул. Металістаў 3, тэл. 77)

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ,

што рамонт розных машынных частак будзе вытвярацца ў 1934 годзе выключна па заяўках прадпрыемстваў.

Прадпрыемствы, жадаючыя планава вытварыць рамонт, павінны даць заводу сваю заяўку з далучэннем падрабязнай спецыфікацыі і НЕ ПАЗНЕЙ 30 ЛІСТАПАДА 1933 г., інакш яны будуць пазбаўлены магчымасці своечасова вытварыць рамонтныя работы, якія будуць выконвацца выключна пры наяўнасці на заводзе свабоднага абталявання.

1070—3—3 3—4

Гарфа абвяшчае, што за неуплату падаткаў і збораў перадаюцца па ацэнцы дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям і прадаюцца з таргоў домаўладанні наступных грамадзян па наступных адрасах і страхавой ацэнцы:

Кірылава Дар'я Радз., Гусёў зав. № 16—1165 р., Козава Ідалія Антон., Пакроўская № 11—7153 р., Новачонак Х.-С. Мордухов, Невельская № 18—3036 р., Гасілоўская Муся Ізр., м.-Ільінская № 21—708 р., Глікман Шолом Х., Кантанічная № 37—5108 р., Хайціна Ліба Цалкаўна, Калінна № 4—6043 р., Круглік Элья Янкелеў, Гразная № 19—3401 р., Наследн. Мойтас, Гразная № 23/32—4169 р., Дынкіны Таўба і Рахіль, Гразная № 5—5213 р., Краўчунас Іван Канст, Ганчарная № 355—1261 р., Клубнікаў А. М., Бебеля 51а—3620 р., Ізмайловіч Марыя С., Духаўскі зав. № 23—1963 р., Цёмкін Ехіель Беркаў, Вінчэўскага № 55—2257 р., Стаякова Аўгена Рыгор., 2-я шасейная № 21—884 р., Монасава Фрыда, Іванаўская вул. № 3—1600 р., Карпава Е. А., Іжкынерная № 16—1511 р., Фалкаў Хаім Беркавіч, Уланаўская № 20—854 р., Насл. Капылавы, Уланаўская № 10—1459 р., Лазоўскія Эмілія і Фідэльская Ядвіга, Тулаўская № 4—2779 р., Хама Фама Сцяпанавіч, Тулаўская № 6—1744 р., Насл. Шнейдэр і Гурэвіч, Урыцкая № 20/66—6233 р., Гаравікова Малання Ер., Лагерная № 1—1049 р., Бескін Хая Беркаўна, Суражская № 29—121 р., Берлін Абрам Юдавіч, Суражская № 14—2300 р., Шчарбакоў, Полацкая № 17а—5220 р., Ляхоўскі Мірон Авер'ян., Н.-Палявая № 1—420 р. Гарадзецкі Кузьма М., 2-я Валадарская № 75—Шыльмейстэр Сора Залм., М.-Жорэса № 15/17—3786 р., Шабанаў Міхась Міхеяў, М. Ільінская № 11—540 р., Старкін Абрам Аронаў, Церасполь ская № 10—896 р., Капусцінскія Л. і Ф., Крапоткіна № 5—5759 р., Гоз Беніям Лейзер., Троіцкая № 53—194 р., Рудніх Мордух Матусаў, Снегіроў зав., № 17—821 р., Юпатаў А. Із., Смаленскае шасе № 62—1393 р., Сіроткін Ем. Андр., Лагерная № 4—1590 р., Сандрыгайла Ірына Іван., Н.-Набережная № 9 і 13 4518 р.

ТАРГІ АДБУДУЦЦА ў памяшканні гарфа (пакой № 8) 1 СНЕЖНЯ, другія 2 СНЕЖНЯ. Пры непродажы з таргоў у гэтыя дні домаўладанні будуць прадавацца гаспадарчым способам.

Загадчык гарфа АРДЫНЦОЎ.
За інспектара ЭПШТЭЙН.

1087—3—1

Сёння, 29-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканні Палаца працы (пакой № 20) склікаецца

АГУЛЬНАГАРАДСКІ СХОД УСІХ СЕКЦЫЙ ІТР.

АБВЕСТКА ДНЯ: Вынікі пленума БелМБІТ і чарговыя задачы ІТР. Даклад старшыні БелМБІТ тав. РОЗІНА

Яўка ўсіх членаў ІТР і трохкутнікаў прадпрыемстваў абавязкова.

ГАРПРАФСОВЕТ, гарМБІТ.

ВЦРК З 25 ЛІСТАПАДА ПРЫСТУПІЎ ДА ПРОДАЖУ БУЛЬБЫ НА СНЕЖАНЬ ПА КАРТЦЫ ЗА ЛІСТАПАД (купон № 12) ПРАЗ СВАЮ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНУЮ СЕТКУ:

Рабочым лесазавода № 3, лямцавай фабрыкі, якія прымацаваны да крам №№ 28 і 30, продаж бульбы будзе вытвярацца ў краме № 30/75, ПА ВІНЧЭЎСКАЙ ВУЛ;

рабочым фабрык інструментальнай, „Прагрэс", люстэркавай, лабораторыі „Зара", якія прымацаваны да крам №№ 25 і 29 у краме № 71 ПА ЗАМКАВАЙ ВУЛ;

партызанам, друкарні „Комінтэрн", якія прымацаваны да крам №№ 55 і 73 (медпрадаўнікам), У КРАМЕ № 41 па Вагзальнай вул;

прымацаваным да крамы № 49 продаж будзе вытвярацца ў краме № 154, НА 1-м ПОЛАЦКІМ РЫНКУ;

рабочым махорачнай фабрыкі, хлебазавода, алейнага завода, спіртазавода, піўзавода, дрожджазавода, мясакамбіната, плодаягаднага завода—У КРАМЕ № 9, ПА ІЛЬІНСКАЙ ВУЛ;

інвалідам, якія прымацаваны да крам №№ 17 і 16 у краме № 86, ПА ВУЛ ЧЫРВОНАГА МІЛІЦЫЯНЕРА;

рабочым выпраўдома, скурзавода, Белуціля, Белэнерга, пажарнай каманды, камгаса ВЭО, лязні, будаўнікам, завода стандартных дамоў, сувязі праз свае ЗАЧЫНЕНЫЯ РАЗМЕРКАВАЛЬНІКІ;

рабочым фабрыкі гнутай меблі, якія прымацаваны да крамы № 15—у краме № 15, НА 1-й МАРКАЎШЧЫНЕ;

прымацаваным да крамы № 13 продаж будзе вытвярацца Ў КРАМЕ № 27 ПА ЛЕНІНСКАЙ ВУЛ.

АБ ТЭРМІНАХ ПРОДАЖА БУЛЬБЫ КОЖНАМУ ПРАДПРЫЕМСТВУ БУДЗЕ АБВЕШЧАНА ФАБКОМАМ.

1083—2—1

ПРАЎЛЕННЕ ВЦРК.

Гр-н КУЗНЯЦОЎ мяне імя Макей на Мацней Асоб, маючых прэтэнзіі супроць змены, просьба паведаміць у Віцебскі ЗАГС (Совецкая 32).
1085—1—1

МАШЫН Сямён Міхайлавіч, ураджэнец Аляксеяўскага сельсавета. Цюплагораўскага раёна, вёскі Мураўка, жадае перамяніць прозвішча Машын на Чарноў. Асоб, маючых прэтэнзіі, просьба паведаміць у Віцебскі ЗАГС.
1086—1—1

Гр. ПЯТРОЎ МІХАСЬ ЯЎХІМАВІЧ, праж. у Віцебску па Лагернай-Уладзіміраўскай вул. № 3, мяняе імя па бацьку Яўхімавіч на Еўдакімавіч. Асоб, маючых прэтэнзіі супроць змены паказаным вышэй грамадзянінам імя па бацьку, просьба паведаміць у Віцебскі ЗАГС. (Совецкая 32)
1049—1—1

ПАКРАДЗЕНА ПЛЕМЯНАЯ КАБЫЛІЦА 4 х год. рыжай масці, на ілбу белая лысіна, заднія ногі белыя. Ведаючых месцазнаходжання просьба паведаміць калгасу «Шлях Леніна», Міхалёўскага сельсавета.
1063—1—1

Гарніт № 12

Друкарня „Комінтэрн", Большэвіцкая, 10.

Адказны рэдактар А. М. КУРЦІК.